

РЭСТАЎРАЦЫЯ ЎСМЕШКІ 9

ТУТ ПАЧЫНАЎСЯ МЕНСК 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЖНІЎНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 166 (30300)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:**

*«Уступленне Беларусі ў ШАС — гэта не проста значная, а эпахальная падзея. Мы, пашыраючы ўзаемадзеянне, маем магчымасць пастаўляць тавары, якія вырабляюцца ў Беларусі. Цяпер у нас каля 20 краін, куды мы пастаўляем сваю прадукцыю, але бачым і перспектывы пашырэння рынкаў збыту. Урадам пастаўлена задача ў сярэднетэрміновай перспектыве давесці экспарт прадукцыі, тавараў і паслуг да паўмільярда долараў. Для нас гэта высокая планка, але мы маем намер яе дасягнуць, у тым ліку з улікам удзелу ў ШАС».*

# Чысціня пад кантролем



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**На прадпрыемстве «БелАсептыка» вырабляюць вельмі запатрабаваную прадукцыю — прафесійныя антысептыкі, дэзынфіцыйныя, мыйныя, ачышчальныя сродкі, якія на сёння ў многіх людзей асацыіруюцца ні больш ні менш з уласнай бяспекай. Таму і кантроль за якасцю і нават за маркіроўкай на ўпакоўцы павінен быць асаблівы. Яго і ажыццяўляе дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў Аксана ЗАРЭЦКАЯ.**

## КОРАТКА

- Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў ліпені 2024 года склала Br2355,1.
- **У Беларусі завяршылася сяўба азімага рапсу.**
- Беларусь па пашыраным бязвізе часцей за іншых наведваюць грамадзяне Германіі, Эстоніі і Італіі.
- **Найбуйнейшы банк краіны за 7 месяцаў гэтага года накіраваў на крэдытаванне ініцыятыў малога і сярэдняга бізнесу больш за 2,2 млрд рублёў.**
- У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» адкрылі завод па вытворчасці ацяпляльнага абсталявання.
- **Каманда АМАПа ГУУС Мінгарвыканкама заняла першае месца на міжнародных спаборніцтвах па тактычнай стральбе ў Расіі.**

По сутнасці справы

## Новыя веды — у абноўленых школах!

**Карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся, як змяніліся ўстановы адукацыі да навучальнага года**

**Менш чым праз тыдзень навучэнцы школ і каледжаў, студэнты зоймуць свае месцы ў класах і навучальных аўдыторыях, дашкалята — у садаўскіх групах. Да заняткаў прыступяць каля 1 мільёна 85 тысяч навучэнцаў, у тым ліку 115 тысяч першакласнікаў.**

**А для школ і іншых навучальных устаноў сённяшнія дні — час наводзіць канчатковы глянец. Асноўныя работы ўжо завершаны, школы атрымалі зацверджаныя пашпарты гатоўнасці, і асноўны клопат цяпер — стварыць для вучняў па-сапраўднаму незабыўнае свята ведаў.**

**Для дзяцей гасцінна расчыняць дзверы 2,6 тысячы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Да 2 верасня ў Беларусі будуць здадзены чатыры новенькія сучасныя школы — у Мінску, Салігорску, Віцебску і ў прысталічнай вёсцы Копішча. Яшчэ тры новабудоўлі ўступяць у строй да канца 2024 года. У 2024/2025 навучальным годзе будуць працаваць 3,7 тысячы дзіцячых садкоў, выхаванцамі якіх стануць 355 тысяч малых.**

**Яшчэ адна добрая навіна: з 2 верасня да харчавання па новых нормах далучацца астатнія 506 школ краіны, то-бок здаровым і смачным школьным харчаваннем будуць забяспечаны ўсе беларускія школы.**

СТАР. 4-5

Спажывец

## АЛЬФА І АМЕГА ЗДАРОЎЯ

### Рапсавы алей як эліксір даўгалецця

**Поліненасычаныя тлустыя кіслоты дыетолагі называюць незаменнымі: гэтыя рэчывы не сінтэзуюцца ў нашым арганізме. Пры гэтым іх недахоп — а часцей не хапае сучаснаму чалавеку амега-3 — вядзе да розных фізіялагічных і біяхімічных парушэнняў.**

Эвалюцыйна ў харчаванні дарослага чалавека закладзена патрэба арганізма ў амега-3 на ўзроўні 1-2 грамаў у суткі, у залежнасці ад полу і ўзросту. Але за апошнія стагоддзі адбыліся істотныя змены ў структуры харчавання і паўсядзённым меню чалавека, якія прывялі да дэфіцыту гэтага рэчыва ў нашым рацыёне.



СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

24166>

9 771990 763008

Важна

# У Беларусі з'явіцца базавы сацыяльны тарыф на сотавую сувязь для насельніцтва

**Прэзідэнт Беларусі 26 жніўня падпісаў Указ № 335 «Аб аказанні паслуг сотавай рухомай электрасувязі»**

У мэтах павышэння даступнасці сотавай сувязі, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб устанаўленні абавязковых для сотавых аператараў патрабаванняў да якасці і ахопу паслуг, што аказваюцца. Пры парушэнні гэтых патрабаванняў сотавыя аператары будуць прыцягнуты да адказнасці.

У адпаведнасці з дакументам сотавыя аператары ў абавязковым парадку павінны будуць накіроўваць частку прыбытку на будаўніцтва новых вышак, мадэрнізацыю дзеючых аб'ектаў і іншыя меры па развіцці сетак сотавай сувязі, што дасць магчымасць павялічыць зону пакрыцця і ўстойлівасць сігналу.

Акрамя таго, указам прадугледжваецца ўвядзенне для насельніцтва базавага сацыяльнага тарыфу, кошт якога будзе знаходзіцца пад кантролем дзяржавы і які стане даступным для ўсіх катэгорый грамадзян.

# Беларускае грамадзянства атрымалі 243 чалавекі, у тым ліку 23 непаўналетнія

**Прэзідэнт Беларусі 26 жніўня падпісаў Указ № 336 аб прыёме ў беларускае грамадзянства 243 чалавекі, у тым ліку 23 непаўналетніх**

Гэта людзі, якія прыбылі ў Беларусь на пастаяннае жыхарства больш за пяць гадоў таму. Яны паспяхова працуюць у сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, транспартнай галіне, у сферы паслуг і гандлю, у галіне медыцыны і сістэме адукацыі. Многія тут стварылі сем'і.

У ліку прынятых у грамадзянства — асобы, якія прыбылі з Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Ірана, Казахстана, Лівана, Малдовы, Расіі, Туркменістана, Узбекістана, Украіны і іншых дзяржаў.

Супрацоўніцтва

# Бізнес — справа жаночая

**Беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай накіравалася ў Рэспубліку Узбекістан з афіцыйным візітам, падчас якога адбудзецца Другі ўзбекска-беларускі жаночы бізнес-форум, паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі. Асноўная частка беларускай дэлегацыі — жанчыны-прадпрымальніцы.**

У першы дзень пройдзе шэсць тэматычных секцый зыходзячы з асноўных кірункаў супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана: машынабудаванне, лёгкая прамысловасць, сельская гаспадарка, хімія і дрэваапрацоўка, медыцынскія і адукацыйныя паслугі, турызм. Асноўная мэта секцыйных пасяджэнняў — прадэманстраваць наш эканамічны патэнцыял, зацікавіць ва ўстанаўленні новых кантактаў.

У другі дзень форуму адбудзецца пленарнае пасяджэнне. Прадугледжваецца таксама арганізацыя выставы прадукцыі беларускай вытворчасці. У экспазіцыі прымуць удзел больш за 50 прадпрыемстваў і арганізацый.

У рамках форуму плануецца падпісанне камерцыйных кантрактаў і дакументаў аб супрацоўніцтве. У Савеце Рэспублікі нагадалі аб выніках Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму: падпісана 14 мемарандумаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве, уключаючы пагадненне аб стварэнні сумеснай гарбарна-абутковай вытворчасці, заключана 15 кантрактаў на больш як Br90 млн, або 350 млрд узбекскіх сумаў.

Кантэкст

# «Беларусь ніколі не была агрэсарам»

## Але мы павінны быць упэўнены ў бяспецы нашых людзей

**МЗС Украіны на сайце ведамства апублікавала заяву аб нібыта недружалюбных дзеяннях Рэспублікі Беларусь. Украінскае знешнепалітычнае ведамства сцвярджае, што наша краіна быццам бы пад выглядам вучэнняў засяроджвае войскі на дзяржаўнай граніцы. Па меркаванні ўкраінскіх дыпламатаў, правядзенне вучэнняў на граніцы непадалёк ад Чарнобыльскай АЭС стварае пагрозы для бяспекі Украіны і міру ў цэлым. Міністэрства абароны Беларусі раней паведамляла аб перакідванні сіл і сродкаў на паўднёвы напрамак па даручэнні Прэзідэнта і Галоўнакамандуючага Аляксандра Лукашэнкі.**

Як падкрэсліў у размове з карэспандэнтам газеты «Звязда» **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Мікалай БУЗІН**, Узброеныя Сілы Беларусі былі прыведзены ў вышэйшую ступень боегатоўнасці і перакінуты да дзяржаўнай граніцы пасля таго, як украінскія беспілотныя лятальныя апараты парушылі нашу граніцу. «Цудоўна разумеем абстаноўку на гэтым напрамку і ніякім чынам не хочам эскалацыі, — звярнуў увагу дэпутат. — Аднак любое дзеянне павінна быць узаемным. Зацікаўленасць украінскага боку будзе разгледжана нашымі кампетэнтнымі органамі, і будзе прынята адэкватнае рашэнне. Але мы павінны быць упэўнены ў бяспецы нашай дзяржавы. Мы павінны быць упэўнены ў бяспецы нашых людзей. Мы разглядаем украінцаў як людзей, з якімі можна размаўляць. Гэта людзі, якія дзесяцігоддзямі жылі і працавалі з намі. Адэкватныя адносіны павінны быць з боку Украіны. Мы ніколі не былі і не будзем агрэсарамі».

Па словах парламентарыя, пытанні, звязаныя з добрасуседскімі адносінамі, ніколі не сыходзілі з поля зроку Рэспублікі Беларусь. «Ніхто не можа нас абвінаваціць у тым, што мы дрэнна адносімся да сваіх суседзяў, — падкрэсліў Мікалай Бузін. — Што датычыцца заявы ўкраінскага боку, гэта чарговая інфармацыйная нагода і спроба перакласці праблему з хворай галавы на здаровую. Рэспубліка Беларусь ніколі не была агрэсарам. Мы выключна адказваем на неадэкватныя дзеянні з любога боку ў адносінах да сябе».

**Вераніка КАНЮТА.**

Канструктыўны дыялог

# СІСТЭМНАСЦЬ У РАБОЦЕ І ЗАДЗЕЙНІЧАННЕ ПАТЭНЦЫЯЛУ ДЭПУТАТАЎ

## Аб чым Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА гаварыў на сустрэчы з кіраўнікамі рэспубліканскіх СМІ

**Перш чым прыступіць да абмеркавання пытанняў, якія датычацца ўдасканалення ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі, спікер расказаў, чым у цяперашні час занятыя парламентарыі, і анансаваў, калі пачнецца работа ў Авальнай зале. У адпаведнасці з Канстытуцыяй, адкрыццё другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання адбудзецца ў трэці аўторак верасня. Атрымліваецца, дэпутаты пачнуць актыўную заканадаўчую дзейнасць у вельмі сімвалічны дзень — 17 верасня, калі ў краіне святкуецца Дзень народнага адзінства.**

### ЗАКАНАДАЎЧЫЯ РАШЭННІ — НА ЭТАПЕ ІХ ЗАРАДЖЭННЯ

Як звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў, новы склад парламента прайшоў пэўнае баявое зладжванне. «Практычна працуем паўгода, з іх тры месяцы — перыяд правядзення першай сесіі, — удакладніў ён. — Ліпень, жнівень ідзе работа непасрэдна па падрыхтоўцы да пачатку другой сесіі, работа ў выбарчых акругах. Сёння ў рабоце знаходзіцца 16 законапраектаў шматлікай ступені гатоўнасці». Аднак гэта, як дадаў спікер, не азначае, што ўсе яны будуць вынесены на абмеркаванне дэпутатаў 17 верасня. Разгляд законапраектаў будзе праводзіцца паэтапна, па меры іх гатоўнасці.

Вяртаючыся да тэмы сустрэчы, Ігар Сергяенка адзначыў, што практычна штодзённа журналісты беларускага тэлебачання, радыё, цэнтральнага інфармацыйнага агенцтва, друкаваных выданняў, інтэрнэт-медыя расказваюць аб рабоце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. «Мы вам удзячны за аператыўную арганізацыю нашай сумеснай работы, — звяртаючыся да кіраўнікоў СМІ, заўважыў спікер. — Колькасць публікацый у перыядычных выданнях, прысвечаных законапраектнай і міжнароднай дзейнасці, рабоце дэпутатаў у акругах, паступова павялічваецца. З'яўляюцца новыя тэматычныя рубрыкі. Узрасла актыўнасць узаемадзеяння дэпутатаў з рэгіянальнай прэсай, у тым ліку вылучаюцца некаторыя цікавыя сюжэты на мясцовым тэлебачанні. Зразумела, што патрэба насельніцтва ў аператыўным атрыманні дакладнай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў і парламента патрабуе ўкаранення новых падыходаў і арганізацыі сістэмнай работы».

Па словах Ігара Сергяенкі, мэта сустрэчы — праводзіць работу са СМІ на сістэмнай, прафесійнай аснове, а таксама вызначыцца, як выкарыстоўваць патэнцыял парламентарыяў у пытаннях тлумачэння дзяржаўнай палітыкі, давядзення да грамадзян інфармацыі аб заканадаўчых рашэннях. Пры гэтым спікер акцэнтаваў увагу, што расказваць аб новаўвядзеннях, прадугледжаных праектамі законаў, варта не толькі пастфактум або на этапе, калі яны прымаюцца, а напярэдадні, калі ідзе працэс абмеркавання заканадаўчых рашэнняў.

«Важным уяўляецца прыкласці сумесныя намаганні па павышэнні пазнавальнасці дэпутатаў у насельніцтва, іх аўтарытэту, — удакладніў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У нас з'явілася шмат новых людзей. Трэба задзейнічаць патэнцыял больш шырокага кола дэпутатаў».

### ГЛЫБОКІ ПОГЛЯД НА РАБОТУ ДЭПУТАТА

У размове з журналістамі Ігар Сергяенка расказаў, што сустрэча, на якую запрасілі кіраўнікоў рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, міністра інфармацыі, дэкана факультэта журналістыкі БДУ, абумоўлена своеасаблівай зверкай гадзінніка, вызначэннем прыярытэтаў сумеснай работы. «Як нам паказваць сёння работу парламентарыяў, чым займаюцца нашы дэпутаты, працуючы непасрэдна тут, у гэтым будынку, як ідзе падрыхтоўка законапраектаў, — агучыў пытанні, вынесеныя на абмеркаванне, спікер. — Паказаць не тую частку, калі ідзе абмеркаванне і прыняцце закона, а як праводзіцца работа над законам, як праходзяць парламенцкія абмеркаванні, круглыя сталы, як выкарыстоўваць патэнцыял дэпутатаў у правядзенні непасрэдна прапагандысцкай работы ў выбарчых акругах, у рэгіёнах. Наступны кірунак — асвятленне дзейнасці непасрэдна дэпутатаў у канкрэтных абласцях, раёнах. З'явіліся новыя рубрыкі, асобныя перадачы. Хацелася б скарэкціраваць гэту работу і ажыццяўляць яе на сістэмнай аснове».

Як падзяліўся з супрацоўнікамі медыя **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ**, сустрэча была вельмі цікавай і карыснай. «Нягледзячы на тое, што работа Палаты прадстаўнікоў прысутнічае на экранах і ў друкаваных сродках масавай інфармацыі, ёсць над чым папрацаваць, — адзначыў ён. — У абсалютнай большасці людзей склалася меркаванне, што работа дэпутатаў адбываецца ў Авальнай зале, хоць насамрэч гэта абсалютна не так. Я сам калісьці працаваў журналістам у парламенце і цяпер па прычыне ажыццяўлення сваіх функцыянальных абавязкаў бываю на пасяджэннях самых розных камісій, дзе адбываюцца вельмі гарачыя спрэчкі, цікавая работа. І як нам усім падаецца, гэта павінна быць у эфіры, людзі павінны гэта ўсё бачыць. Мы сёння сабраліся не для таго, каб зрабіць работу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў больш медыйнай, а для таго, каб глыбей паказаць тое, чым займаюцца парламентарыі. У найбліжэйшы час нашы тэлегледачы, чытачы і слухачы ўбачаць некаторыя змяненні, звязаныя з тым, як у нашых СМІ асвятляецца работа народных выбраннікаў».

**Вераніка КАНЮТА.**

З нагоды

# Служыць Закону, Народу, Айчыне!

**У Віцебску адсвяткавалі 106-ю гадавіну з дня заснавання губернскай міліцыі. Урачыстасці прайшлі на плошчы Перамогі каля мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў.**



Захоўваючы традыцыі, закладзеныя больш чым стагоддзе таму, праваахоўнікі Віцебскай вобласці адзначылі чарговую гадавіну з дня заснавання губернскай міліцыі. На ўрачыстай цырымоніі, прымеркаванай да значнай падзеі, ахоўнікі парадку аддалі даніну памяці пакаленню пераможцаў, у тым ліку супрацоўнікам міліцыі, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны змагаліся за свабоду Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мерапрыемства пачалося з урачыстага выносу сцяга і харугвы УУС пад гукі марша Праабражэнскага палка. Пасля чаго прысутныя ўшанавалі хвілінай маўчання памяць супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку, і ўсклалі вянкі і кветкі да Вечнага агню.

Ва ўрачыстым мерапрыемстве ўзялі ўдзел старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін, начальнік абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Андрэй Любімаў, кіраўнікі органаў улады і сілавых ведамстваў, супрацоўнікі УУС Віцебскай вобласці, ветэраны, выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў, юныя інспектары руху, ганаровыя госці і члены сем'яў супрацоўнікаў.



З віншавальным словам да праваахоўнікаў паўночнага рэгіёна звярнуўся кіраўнік вобласці: «Як бы ні змяняўся час, галоўнымі задачамі для міліцыі заўсёды былі і застаюцца ахова правапарадку, забеспячэнне законнасці і абароны кожнага грамадзяніна. Сёння структурныя падраздзяленні ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама маюць магутны патэнцыял, яны здольныя апярэдзіць абвастрэнне крыміналагеннай сітуацыі, застаючыся надзейным шчытом і мячом рэгіёна і краіны ў цэлым. Перад вамі стаяць маштабныя і няпростыя задачы. Гэта забеспячэнне грамадскай бяспекі і процідзеянне тэрарызму, абарона эканомікі ад крымінальнага ціску, барацьба з карупцыяй. Поспех тут залежыць ад выразнасці і зладжанасці дзеянняў, ад уменняў прымаць вывераныя рашэнні і аналізаваць сітуацыю. Самая аб'ектыўная ацэнка вашай дзейнасці — гэта давер грамадзян. Заслужыць яго можна толькі бездакорным выкананнем сваіх службовых абавязкаў, што вы штодня і дэманструеце жыхарам і гасцям нашай вобласці», — сказаў Аляксандр Субоцін.

Начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама генерал-маёр міліцыі Андрэй Любімаў адзначыў, што міліцыя Віцебшчыны прайшла нялёгкі шлях развіцця і сёння застаецца адной з галоўных апор дзяржаўнай улады, асноўным інструментам барацьбы са злачыннасцю, гарантавання грамадскай бяспекі, абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян. «У гісторыі віцебскай міліцыі было шмат гераічных старонак: у розны час нашы суайчыннікі добрасумленна і самааддана забяспечвалі правапарадак, многія з іх аддалі жыцці, да канца застаючыся вернымі прысязе і афіцэрскаму абавязку. Мы з'яўляемся пераемнікамі найлепшых традыцый, якія перадалі нам ветэраны органаў унутраных спраў — яны і сёння знаходзяцца ў страі і гатовыя аказваць дапамогу ў раскрыцці злачынстваў, навучанні і выхаванні маладых супрацоўнікаў. На працягу апошніх гадоў у Віцебскай вобласці назіраецца тэндэнцыя зніжэння ўзроўню злачыннасці, які самы мінімальны ў нашай краіне. Органы ўнутраных спраў Віцебшчыны займаюць лідзіруючыя пазіцыі ў Рэспубліцы Беларусь, што яшчэ раз сведчыць аб прафесіяналізме нашых супрацоўнікаў», — падкрэсліў Андрэй Юр'евіч.

Ва ўрачыстай абстаноўцы пад гукі фанфар супрацоўнікаў органаў унутраных спраў паўночнага рэгіёна ўзнагародзілі медалямі «За бездакорную службу» II і III ступені, нагруднымі знакамі, прысвоілі чарговыя спецыяльныя званні, уручылі падзякі ад міністра і намесніка міністра ўнутраных спраў, а таксама ганаровыя і памятныя граматы ад УУС і Віцебскага аблвыканкама.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**

Конкурс

# КЛАСНЫЯ КІРОЎЦЫ

## Конкурс прафесійнага майстэрства сярод вадзіцеляў пошты прайшоў у Брэсце

**Наша пошта, як вядома, вызначаецца мабільнасцю. Каб газеты, пісьмы, пасылкі, розныя тавары своечасова атрымаў адрасат, вадзіцелі працуюць кругласутачна. Вызначыць найлепшых у прафесіі сабраліся паштовыя кіроўцы ў канцы мінулага тыдня ў Брэсце.**

Першы этап конкурсу быў тэарэтычны і крыху нагадваў экзамен у ДАІ. Другі этап прадугледжваў праверку машыны на спраўнасць. Трэба было знайсці некалькі няспраўнасцяў, з якімі нельга пачынаць рух. Апошні этап уяўляў сабой кіраванне машынай па аўтадроме, дзе фіксаваўся час.

І вось падвездзены вынікі спаборніцтва, названы імёны пераможцаў. У агульнакамандным заліку першае месца заняла аўтатранспартная вытворчасць РУП «Белпошта», на другой прыступцы — каманда Гомельскага філіяла РУП «Белпошта», і трэцяе месца — у Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта».

Першае месца сярод вадзіцеляў у класе «Пежо партнёр» заняў Сяргей Мінчукоў з Віцебскага філіяла РУП «Белпошта». Пераможцам у класе «ГАЗ 2705» стаў Аляксандр Шпілеўскі, прадстаўнік аўтатранспартнай вытворчасці галаўнога падраздзялення.

На другім месцы — Аляксандр Лянкевіч (галаўное падраздзяленне РУП «Белпошта») і Аляксандр Гірман (Магілёўскі філіял РУП «Белпошта). Трэцяе месца заваявалі Сяргей Шубёнак (Гомельскі філіял РУП «Белпошта») і Сяргей Жыткові́ч (Брэсцкі філіял РУП «Белпошта»).

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта».**



# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША рыхтуюць «каляровую рэвалюцыю» ў Грузіі



Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на інфармацыю прэс-бюро Службы знешняй разведкі (СЗР) Расійскай Федэрацыі. Вашынгтон перад парламенцкімі выбарамі ў Грузіі плануе нарасціць ціск на ўлады краіны, каб максімальна аслабіць пазіцыі партыі «Грузінская мара», адзначаюць у СЗР РФ. «Паводле інфармацыі, якая паступае, у Белым доме вельмі не задаволены развіццём сітуацыі ў Грузіі напярэдадні парламенцкіх выбараў», — адзначаецца ў паведамленні. Парламенцкія выбары ў аднапалатны парламент Грузіі запланаваны на 26 кастрычніка. Улады краіны раней неаднаразова заяўлялі, што грузінскія няўрадавыя арганізацыі, якія фінансуюцца з-за мяжы, удзельнічаюць у перадвыбарнай кампаніі, падтрымліваючы апазіцыйныя партыі, ладзячы для іх розныя мерапрыемствы, мітынгі, агітуючы супраць цяперашняга ўрада, адзначыў ТАСС. Яны таксама абвінавачвалі некаторых заходніх палітыкаў у тым, што тыя адкрыта падтрымліваюць апазіцыйныя партыі і выступаюць супраць улад.

### Даходы абаронных кампаній дасягнуць рэкордных значэнняў



Найбуйнейшыя сусветныя кампаніі аэракасмічнай і абароннай прамысловасці могуць атрымаць рэкордны прыбытак на працягу наступных трох гадоў з-за росту дзяржаўных заказаў на новую зброю на фоне росту геапалітычнай напружанасці, паведаміла газета Financial Times. Паводле прагнозаў, якія былі прадстаўлены выданню даследчай кампаніяй Vertical Research Partners, 15 вядучых абаронных кампаній у 2026 годзе атрымаюць свабодны грашовы паток у памеры 52 мільярдаў долараў, што амаль удвая перавышае іх сукупны грашовы паток на канец 2021-га. Адзначаецца, што да канца 2026-га пяць вядучых падрадчыкаў абароннай прамысловасці ЗША атрымаюць прыбытак у памеры $26 млрд. Выданне адзначае, што цяпер галіна выйграе ад рэзкага павелічэння ваенных выдаткаў, паколькі ўрады павялічваюць свае бюджэты на фоне канфлікту ва Украіне і эскалацыі напружанасці на Блізкім Усходзе і ў Азіі.

### Больш за 45 музеяў і галерэй у Шатландыі могуць закрыцца з-за крызісу фінансавання



Аператары некаторых музеяў занепакоены тым, што яны стануць «неплацежаздольнымі да канца года», калі сектару не будзе выдзелена новае фінансаванне. Аб гэтым паведаміла газета The Scotsman. Нядаўняе даследаванне Museums Galleries Scotland, арганізацыі, што фінансуецца шатландскім урадам, якая падтрымлівае больш за 440 славутасцяў, паказала, што 11 працэнтаў з іх рызыкуюць закрыцца на працягу 12 месяцаў, 14 працэнтаў маюць фінансавыя рэзервы толькі на адзін месяц работы, а 28 працэнтаў — усяго на тры месяцы. Адзначаецца таксама, што сектар сутыкаецца з «крызісам набору персаналу» з-за нізкага ўзроўню аплаты і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

# «РАЗУМНАЯ» ШКОЛА Ў ПАДАРУНАК

**Жыхары мікрараёна вуліц Грышына, Стасава, Бярозаўская ў Магілёве, чые дзеці сёлета пойдуць у школу, сустракаюць навучальны год з узнёслым настроем. У іх двайное свята. Па-першае, Дзень ведаў, па-другое — адкрыццё новай навучальнай установы. Па начынні і высокатэхналагічнасці школа № 24 перасягнула ўсе іх чаканні. Гэта суперсучасны комплекс, дзе ўсё камп'ютарызавана, аўтаматызавана, адным словам, зроблена па апошнім слове тэхнікі. Гэта адзначаюць усе, хто прыносіць сюды заяву на навучанне.**

Будаўнічыя работы планаваліся завяршыць да 1 верасня 2025 года, але будаўнікі справіліся раней. Праз тыдзень тут ужо будзе шматлюдна і шумна ад дзіцячых галасоў. Сёння ідуць апошнія прыгатаванні да прыёму школьнікаў, добраўпарадкоўваецца тэрыторыя.

**Дырэктарам школы № 24, якой прысвоена імя К. Сіманава, стала Людміла ЗДОРЫКАВА,** у мінулым дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

— Гэта вельмі адказная пасада, — прызнаецца яна. — Установа разлічана на 1020 дзяцей, кожны з іх — асоба, да кожнага патрэбен асаблівы падыход, каб было камфортна вучыцца. Мікрараён хутка расце, тут багата шматдзетных сем'яў. Школу даўно чакалі, яе адкрыццё — вельмі хвалюючы момант.

Праект школы распрацаваны інстытутам «Магілёўграмадзянпраект», кошт аб'екта — больш за 46 мільёнаў рублёў. У будаўніцтве выкарыстоўваліся высокакасныя матэрыялы самых апошніх тэхнічных характарыстык.

Чатырохпавярховы будынак складаецца з трох функцыянальных блокаў — малодшая і старшая школы, адміністрацыйная частка. На першым паверсе — прасторны вестыбюль, сталовая на 340 пасадачных



месцаў, чытальная зала, кнігасховішча, дапаможныя памяшканні. На другім — актавая, спартыўная і трэнажорная залы. На трэцім і чацвёртым — рэсурсныя цэнтры, лабараторыі. У падземнай частцы — гардэроб, цір, гаспадарчыя памяшканні.

Пакуль у дзеянне ўводзіцца асноўны будынак, другая чарга — двухпавярховы будынак з басейнамі, які будзе злучаны галерэяй са школай. Работы на ім яшчэ працягваюцца. Гэта будзе выключная спартыўная база. На першым паверсе — два басейны: адзін — памерам 25 на 13,5 метра з глыбінёй 1,2—1,45 метра, другі — з чашай 10 на 3,6 метра глыбінёй 0,65—0,9 метра для навучання плаванню дзяцей да 10 гадоў. На другім паверсе размешчаны трэнажорная і гімнастычная залы, дапаможныя памяшканні.

— Гэта будзе «разумная» школа, або школа будучыні, як яе называюць тыя, хто хоць аднойчы тут пабываў, — адзначыла Людміла Здорыкава. — З такой тэхнічнай базай яна стане адной з найлепшых у горадзе. Тут два камп'ютарныя кабінеты, чатыры лінгафонныя, існуе перасовачны камп'ютарны мабільны клас. Усе кабінеты абсталяваны камп'ютарнай тэхнікай, створана лакальная сетка, ёсць выхад у інтэрнэт. Бібліятэка абсталявана ўсёй неабходнай лічбавай тэхнікай.

### У тэму

Сучасныя шматфункцыянальныя школы-комплексы — гэта сённяшняя палітыка дзяржавы. На Магілёўшчыне сёлета адкрываецца яшчэ адна новая школа ў Асіповічах на 955 месцаў. Тут створаны ўсе магчымасці для атрымання якаснай адукацыі, раскрыцця ў навучэнцаў творчых і спартыўных талентаў. Улічаны таксама інклюзіўныя моманты.

Па інфармацыі абласнога ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, падпісаны і зацверджаны ўсе 312 пашпартоў гатоўнасці ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года. На капітальны і бягучы рамонты іх сёлета было выкарыстана 87,5 мільёна рублёў. Ва ўсіх установах драўляныя аконныя блокі заменены на блокі ПВХ, адрамантавана спартыўнае абсталяванне. Асаблівая ўвага пры падрыхтоўцы школ да новага навучальнага сезона ўдзялялася пытанням забеспячэння пажарнай і грамадскай бяспекі. Усе школы абсталяваны сістэмамі відэаназірання, у 69 арганізаваны пасты міліцыі.

Тое, што гэта высокатэхналагічная школа, сведчыць нават адзін факт: тут устаноўлены 62 мультыборды! Шмат што створана для развіцця дзяцей. Ёсць нават зала для заняткаў харэаграфіяй.

У школе найлепшыя ўмовы для заняткаў спортам: вялікая зала мае ўнікальнае пакрыццё міжнароднага класа з высокай ступенню амартызацыі, што да мінімуму зводзіць верагоднасць траўм. Для фізкультуры на вуліцы прадугледжана буйное спартыўнае поле са штучным пакрыццём, ёсць валейбольныя, баскетбольныя, тэнісныя пляцоўкі, сучасная дзіцячая гульнявая лакацыя, вулічныя сталы для настольнага тэніса, пляцоўка для вывучэння правіл дарожнага руху і вельмі шмат зон для адпачынку і гульняў.

— Для дзяцей першых класаў мы набылі спецыяльную мэблю, якая створана з улікам іх фізіялагічных асаблівасцяў, — расказвае дырэктар. — Камфортныя ўмовы для заняткаў — важны складнік адукацыйнага працэсу. Вялікую ўвагу ўдзялілі афармленню школы. Кожны паверх — з асаблівай тэматыкай. Адзін прысвечаны любімаму гораду пад назвай «Мой горад на скрыжаванні стагоддзяў», другі — беларускай гісторыі і традыцыям, асобна выдзелілі тэматыку «Беларусь — краіна герояў» — паверх афармлены з ухілам — грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. На 10-й паралелі ў школе будзе функцыянаваць патрыятычны клас. У афармленні памяшканняў нам дапамаглі педагогі дадатковай адукацыі, размалёўвалі сцены. Кожная работа аўтарская, болей нідзе не паўтараецца.




Пытанню бяспекі ў новай школе ўдзяляецца асаблівая ўвага. У кожнага дзіцяці будзе шматфункцыянальная карта навучэнца, якая прызначана служыць як прапускным

# «ГАТОВЫЯ

## Высветлілі, чым уразіць




**Да новага навучальнага года застаюцца лічаныя дні. Ужо хутка ўстановы адукацыі адчыняць свае дзверы для дзяцей і іх бацькоў. Асабліва важным гэта імгненне з'яўляецца для тых, хто сёлета прыйдзе па веды ўпершыню. Аднак перад тым, як прыняць вучняў, школы праводзяць актыўную падрыхтоўку, купляюць новае сучаснае абсталяванне, праводзяць бягучы і капітальны рамонт. Нядзіўна: тут павінна быць камфортна і бяспечна. Карэспандэнт "Звязды" наведаў сталіцу шахцёраў і на прыкладзе сярэдняй школы № 6 горада Салігорска высветліў, наколькі школы Міншчыны гатовы да свята Першага верасня.**

Шостая школа Салігорска была пабудавана ў 1971 годзе, у ёй навучаецца каля 510 хлопчыкаў і дзяўчынак, якіх сёлета школа сустрэне новымі стадыёнам і спартыўнай залай. Рамонт гэтых аб'ектаў пачаўся ў чэрвені, адразу пасля заканчэння навучальнага працэсу.

«Школа невялікая па колькасці, але пры гэтым утульная і цёплая. Тут працуюць выдатныя педагогі з вышэйшай адукацыяй і кваліфікацыяй. Нядаўна ў нас скончыўся рамонт спартыўнай залы — яна была цалкам пераабсталявана. Таксама істотна змяніўся і наш стадыён: ён стаў сучасным і адказвае ўсім патрабаванням бяспекі, — распавяла **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Алена ЛАГВІНОВІЧ.** — Тут пакладзены дарожкі, абсталяваны баскетбольная, валейбольная і футбольная пляцоўкі. Ну і куды ж без турнікоў ды трэнажораў? Таму мы рады, што змяняемся ў лепшы бок».

Спартыўнай зале, як і самой школе, споўнілася 53 гады. Зразумела, што пабелка, падлогі, сцены — усё было, мякка кажучы, не ў лепшым стане. «Прыйшлося рабіць грандыёзны бягучы рамонт, — расказаў **дырэктар школы Пётр БАБРОЎНІК.** — Мы ўсё пабялілі, пашпаклявалі, пафарбавалі. Да гэтага было лямпачнае асвятленне. Цяпер яно сучаснае, якаснае, прымальнае па ўсіх санітарных нормах. Усе сцены атынкаваны і пафарбаваны. Таксама паклалі і новую падлогу. Будзем старацца падтрымліваць адрамантаваныя месцы ў належным стане, бо ад гэтага залежыць вельмі многае».

Ён дадаў, што сёлета ў школу набіраецца два першыя класы па 25 чалавек: «Сярэдні ўзрост педагогаў — каля 45 гадоў. Ды і цякучкі кадраў няма: людзі працуюць даўно, настаўнікі ў асноўным вопытныя і дарослыя. Моладзь ёсць, але, на жаль, няшмат. Сёлета да нас прыйшоў адзін малады настаўнік. Усяго тут працуюць чатыры маладыя спецыялісты. Дзеці асабліва любяць такіх настаўнікаў, таму што яны сучасныя, умела карыстаюцца камп'ютарнымі тэхналогіямі».

Школьныя кабінеты таксама адпавядаюць патрабаванням часу і аснашчаны ўсім неабходным абсталяваннем. Любімым у вучняў па праве лічыцца кабінет беларускай мовы і літаратуры. «Ён афармлены ў беларускім стылі. Там створаны міні-музей, дзе прадстаўлены розныя рамёствы, якімі займаўся беларускі народ, — сказаў Пётр Баброўнік. — У кабінеце можна ўбачыць, як пралі нашы продкі, як апрацоўвалі гліну і ствараглі нацыянальныя касцюмы. Экспанаты міні-музея збіраліся агульнымі намаганнямі. У гэтым вялікая заслуга нашага настаўніка беларускай мовы і літаратуры, а таксама дзяцей і іх бацькоў».




Летась школа атрымала кабінет інфарматыкі, абсталяваны новай камп'ютарнай тэхнікай. А нядаўна падарылі 3D-прынтар. Цяпер даследчая дзейнасць стане больш цікавай, што дазволіць максімальна раскрываць свой творчы патэнцыял, упэўнены дырэктар установы.

«У сувязі з рамонтнымі работамі перанеслі тэрмін правядзення школьнага дзіцячага лагера на жнівень. Сёння ў нас адпачываюць 110 чалавек, прычым дзеці не толькі з нашай установы. Школьны лагер наведваюць вучні 1—8 класаў. Бацькі з задавальненнем прыводзяць да нас дзяцей, бо ведаюць, што яны заўсёды будуць пад пільным наглядам», — адзначыў Пётр Баброўнік.

Дарэчы, на базе летніка працуе атрад дзесяцікласнікаў. «Старшакласнікі дапамагаюць настаўнікам, займаюцца з дзецьмі ў якасці важатых. Па ўжо добрай традыцыі нашы дзеці з задавальненнем наведваюць Эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і моладзі», — дадала Алена Лагвіновіч.

У школе дзейнічаюць профільныя класы. «Сёлета адкрываем два дзясятыя класы, дзе профільнымі будуць англійская і руская мова, а таксама матэматыка. У школе ёсць ваенна-патрыятычны клас. Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні праводзіць факультатыўныя заняткі сумесна з класным кіраўніком. На працягу года дзеці ездзяць на

дакументам, так і ў якасці плацежнага сродку, праязнога, чытальнага білета. І, як адзначыла дырэктар, функцыі карты будуць паступова пашырацца.

Мікраён, у які ўваходзіць большасць дамоў па вуліцах Бярозаўская, Стасава, Грышына і Калужская, густанаселены і дастаткова малады.

— Мы ў захапленні ад новай школы, — кажа шматдзетная маці Наталля Севасцьянава. У новую школу пойдуць усе трое яе дзяцей — у другі, трэці і дзявяты класы. — Мы жывём у доме па вуліцы Бярозаўскай, раней наведвалі школу № 25. Але яна перапоўненая, сярэдняя дачка хадзіла ў першы клас пры дзіцячым садку. Калі мы яе прывялі туды на заняткі, вельмі здзівілялася, маўляў, чаму яна зноў павінна хадзіць у садок. Хаця і форма ў дзяцей была школьная, але асацыяцый са школай не існавала. Мы неаднаразова звярталіся да мясцовых улад з просьбай пабудаваць нам яшчэ адну школу. І нас пачулі.

Наталля расказвае, што, як толькі пачаўся прыём дакументаў у новую школу, яна была сярод першых. Прыйшла да адкрыцця — у 8.00, а падала толькі бліжэй да абеду: вельмі шмат аказалася ахвотных. Наталля Севасцьянава паклапацілася нават арганізаваць каманду для правядзення ў новай установе суботніка.

— Спачатку нам казалі, што не трэба, бо яшчэ працуюць будаўнікі, але мы настаялі, — усміхаецца суразмоўніца. — Напісала ва ўсіх нашых чатах, што ёсць магчымасць папрацаваць на карысць школы, і адразу ж пайшлі водгукі. У гэту суботу прыйшло чалавек 20, каб паўдзельнічаць у сумеснай працы. Прычым з усім неабходным інвентаром і нават музычнай калонкай. Наводзілі марафет у сталовай. Вы не ўяўляеце, якая яна прасторная і сучасная. А вучэбныя кабінеты — гэта наогул фантастыка. Там усё з прыстаўкай «супер», створаны выдатныя ўмовы для ўсебаковага развіцця дзяцей. Будынак даступны і для маламабільных дзяцей. Прадугледжаны ліфт, парковачныя месцы. Тут усё прадумана да дробязяў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Наталлі СЕВАСЦЬЯНАВАЙ.**

# Выглядае як новая

## Капітальны рамонт будынка школы з мадэрнізацыяй правялі ў Пінскім раёне

**Стытычаўская сярэдняя школа была пабудавана ў 1967 годзе. У 2000-м да старой школы ўзвялі двухпавярховую прыбудову, а яшчэ праз 20 гадоў дабудавалі спартыўную залу. Але ж будынак, якому без малога 60 гадоў, даўно патрабаваў грунтоўнага абнаўлення. І вось год таму аб'ект уключылі ў план, выдзелілі фінансаванне. А сёлета ў школу прыйшлі спецыялісты СПМК № 33 ААТ «Пінсксаўгасбуд» і ў сціслыя тэрміны правялі капітальны рамонт з мадэрнізацыяй установы адукацыі.**



Як расказаў карэспандэнту газеты **дырэктар школы Міхаіл САЧКОЎСКІ,** асноўная работа вялася ў старым аднапавярховым будынку, дзе размяшчаецца пачатковая школа:

— Шэсць вучэбных кабінетаў цалкам абноўлены. Яны выглядаюць светлымі, утульнымі, тут новае ўсё: сцены, падлога, столі, дзверы, асвятленне. Акрамя таго, будаўнікі правялі замену даху, умацавалі кроквы. Таксама правялі ўцяпленне двухпавярховага і аднапавярховага будынкаў, 38 акон заменены на новыя.

— Напрыклад, у майстэрні, дзе праходзяць урокі працы, цяпер ёсць гарачая вада, абноўлены бібліятэка, пакой дзіцячых ініцыятыў і кабінет хіміі, — працягвае Міхаіл Міхайлавіч. — Рамонт зроблены і ў санвузлах. Наогул, такое ўражанне, што пераўтварылася ўся школа. Адначасова праводзілася добраўпарадкаванне тэрыторыі. Скажам, раней не было асобнага пад'езду для прадуктовай машыны, смеццявоза, і гэта стварала дадатковыя нязручнасці, цяпер асобны пад'езд для грузавога транспарту абсталяваны. Як і пляцоўка пад кантэйнеры для бытавых адходаў. Цяпер у нас ёсць і пандус для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — гаворыць дырэктар школы. — Адначасова заканчваем навядзенне прыгажосці на тэрыторыі, уладкоўваем клумбы, высаджваем кветкі, дэкаратыўныя кусты.

Яшчэ дырэктар расказаў, што на фінальную стадыю выходзяць клопаты па абсталяванні кабінетаў. Новая мэбля і абсталяванне паступілі ў кабінет хіміі, часткова заменена тэхнічнае начынне майстэрні. З мэбляй дапамагаюць у тым ліку спонсары. Філіял «Невель» ААТ "Пінская мясакамбіната" памог з закупкай шафаў, сталоў, крэслаў. Збіраць, расстаўляць мэблю, рыхтаваць класы да навучальнага года дапамагаюць і бацькі.

Мама вучня 7 класа Вольга Палюховіч падзялілася з карэспандэнтам газеты радасцю з нагоды рамонту і мадэрнізацыі школы:

— Нашу школу не пазнаць! Калі хто ўпершыню заедзе ў Стытычава, можа падумаць, што гэта новая школа, узведзеная па арыгінальным праекце, дзе ў склад школьнага комплексу ўваходзіць будынкі рознага прызначэння. Тут усё новае, прыгожае. Дзецям будзе надзвычай камфортна вучыцца, займацца ў гуртках і секцыях, наведваць бібліятэку. Наша школа хоць і вясковая, але даволі перспектыўная, колькасць вучняў расце.

Паводле слоў Міхаіла Сачкоўскага, першага верасня за парты сядзе 95 вучняў, але ў наступныя гады чакаецца рост колькасці школьнікаў. Населены пункт прыгарадны, ваколіцы Пінска забудоўваюцца, а жыхары суседніх новабудоўляў усё часцей робяць выбар на карысць сельскай школы. Так што капітальны рамонт і мадэрнізацыя былі вельмі дарэчы, цяпер далёка не ўсе гарадскія школы могуць пахваліцца такімі ўмовамі для вучобы і работы.

**Віктар ГАЎРЫЛОВІЧ, начальнік аддзела па адукацыі Пінскага райвыканкама** паведаміў:

— У нашым раёне 32 установы адукацыі, дзе вучыцца каля чатырох тысяч школьнікаў. У іх праведзены рамонт, заменены вокны, зроблены рамонт фасадаў, дахаў, праведзены іншыя работы для паляпшэння ўмоў знаходжання вучняў. Але самым значным праектам гэтага года выглядае рамонт з мадэрнізацыяй Стытычаўскай сярэдняй школы, на які накіравана 1 мільён 328 тысяч рублёў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Стытычаўскай школы.**

# НА 100 ПРАЦЭНТАЎ!»

## вучняў салігорская школа





экскурсіі, наведваюць музеі, мемарыяльныя комплексы па ўсёй Беларусі, удзельнічаюць у школьных і гарадскіх мерапрыемствах», — падкрэсліла намеснік дырэктара.

Па словах дырэктара, выпускнікі школы паступаюць у шматлікія ВНУ краіны. «Няма такой навучальнай установы, дзе не было нашых вучняў. Сёлета мы выпусцілі адзін 11 клас. Нас вельмі радуе, што сярод выпускнікоў ёсць тыя, хто, ледзячы на сваіх выкладчыкаў, асэнсавана выбіраюць педагагічную дзейнасць і паступаюць у педагагічныя ВНУ. Сёлета наш выпускнік стаў пераможцам рэспубліканскай алімпіяды, дзякуючы чаму паступіў без экзаменаў у Мазырскі педагагічны ўніверсітэт. Мы ўпэўнены, што ён абавязкова вернецца да нас ужо ў якасці маладога настаўніка».

Школа гатовая да новага навучальнага года на 100 працэнтаў! Тут ёсць усё неабходнае абсталяванне. У кожным класе можна ўбачыць тэлевізары, настаўнікі актыўна карыстаюцца камп'ютарамі, што дазваляе якасна падаваць інфармацыю. Мы з нецярпеннем чакаем Дзень ведаў, калі школа зноў адчыніць дзверы для любімых вучняў. Упэўнены, што абсалютна ўсе прыйдуць бадзёрымі, загарэлымі. А з новымі сіламі і энергіяй пачнём новы навучальны год!» — выказаў перакананне Пётр Баброўнік.

«Для нас, настаўнікаў, а таксама для дзяцей і іх бацькоў, Дзень ведаў — вялікае свята. Асаблівы гэты дзень для тых бацькоў, якія ўпершыню прывядуць сваіх дзяцей у нашу школу. Сёлета першы ўрок будзе называцца «Нам ёсць, чым ганарыцца. Нам ёсць, што берагчы». У Год якасці і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў размова пойдзе пра дасягненні беларускага народа, якімі мы па праве ганарымся, а таксама пра каштоўнасці, якія неабходна захаваць у імя будучыні», — акцэнтавала Алена Лагвіновіч.

Увогуле, мадэрнізацыя і рамонт класаў пачаліся гадоў шэсць таму. «Штогод прыводзім у парадак усе памяшканні школы. Пачыналі з трэцяга паверха, і вось ужо дайшлі да першага. Выкарыстоўваем новыя будаўнічыя матэрыялы, сучасныя фарбы. Дзякуючы гэтаму наша школа набывае добры, якасны выгляд. Дарэчы, на рамонт спартыўнай залы і стадыёна было выдзелена 500 тысяч беларускіх рублёў, якія выкарысталі па прызначэнні», — падагульніў дырэктар.

На базе школы дзейнічае унікальны рэсурсны цэнтр бяспекі жыццядзейнасці, які складаецца з двух пакояў і вялікага фае. «Там праводзяцца заняткі для вучняў як нашай школы, так і з усяго раёна. На працягу навучальнага года да нас прыводзяць дзяцей. У цікавай, інтэрактыўнай форме праводзім заняткі па бяспецы жыццядзейнасці. Школьнікі вучацца, як правільна сябе паводзіць пры надзвычайных сітуацыях: выклікаць ратавальнікаў, аказаць першую дапамогу пры ўтапленні і інш. Таксама ёсць спецыяльны калідор-лабірынт, у якім дзеці вучацца выходзіць з цёмнага, задымленага памяшкання. Тут паказваем, як правільна дзейнічаць пры пажары, трэніруем псіхалагічную ўстойлівасць, бо ад гэтага можа залежаць іх жыццё. Пры дапамозе дым-машыны напаўняем пакой дымам, уключаем сірэну і вучым дзяцей, як правільна сябе паводзіць і як рухацца».



Усе сцены школы аформлены сучасна, з неабходнай інфармацыяй, малюначкамі і QR-кодамі. Па словах Алены Лангвіновіч, тут усё прыгожа, сучасна, ярка, а гэта зацікаўлівае дзяцей: «У дадзеным памяшканні ствараецца практычна рэальная надзвычайная сітуацыя. Нашы вучні паспяхова і з задавальненнем праходзяць праз такое выпрабаванне. Ёсць у нас і сучасны манекен — трэніруем дзяцей аказваць першую медыцынскую дапамогу».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 630/D-48930, расположенное по адресу: Минская область, Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 13-3, общей площадью 1145,2 кв. м** |
| **Начальная цена продажи** | 1 400 400 бел. руб. (один миллион четыреста тысяч четыреста рублей 00 коп.), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 233 400,00 бел. руб. (двести тридцать три тысячи четыреста рублей 00 коп.) |
| **Сумма задатка** | 140 040 бел. руб. |
| **Дата проведения аукциона** | 30.09.2024 в 11.00 |
| **Сроки и место подачи документов на участие** | **До 15.00 25.09.2024 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1-4, каб. 507** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону: 8 (017) 3624955 |
| **Дополнительное условие** | Возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Возместить затраты на проведение оценки |

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов**

**Лот № 1.** Капитальное строение, инвентарный номер 200/С-52996, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ наименование: здание складского помещения, пл. 146,2 кв. м, расположенное на зем. участке № 240100000002001222 (доля 71/1000), пл. 0,2588 га.

**Характеристики лота № 1.**

Кап. строение с инв. № 200/С-52996 находится по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 168, кол-во этажей 1. Год постройки не определен, дата гос. регистрации создания 07.02.2006. Составные части отсутствуют. Фундамент – бетонный; наружные внутренние капитальные стены – силикатные блоки; перегородки силикатные блоки; крыша (кровля) шиферная; полы – бетонные, проемы оконные простой работы; проемы дверные – ворота металлические, внутренняя отделка штукатурка; электроосвещение – открытая проводка; вентиляция – естественная. Расположенное на зем. участке с кад. № 240100000002001222 (доля 71/1000), пл. 0,2588 га (договор аренды от 15.05.2013 № 761/2013, срок действия до 25.03.2043). Назначение: земельный участок для содержания и обслуживания магазина. Имеется ограничения (обременения): охранная зона линий связи и радиофикации, пл. 0,0102 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов (канализация), пл. 0,0340 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов (водопроводов), пл. 0,0326 га. Ограничения (обременения) прав: арест, наложенный постановлением Инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Ленинскому району г. Гродно от 01.12.2023 (арест снимается после полной оплаты стоимости приобретенного имущества).

**Нач. цена продажи имущества: 25272 белорусских рубля и 00 копеек. Размер задатка: 2527 белорусских рубля 20 копеек.**

**Условия:**

1. Участник аукциона, выигравший торги, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе предмета торгов не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 рабочих дней. Оплата стоимости приобретенного на аукционе недвижимого имущества иностранными физическими и юридическими лицами осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли или за иностранную валюту по официальному курсу белорусского рубля по отношению к иностранной валюте, установленному Национальным банком на дату платежа в соответствии с валютным законодательством.

2. Оформление документов и переход права собственности на приобретенный на аукционе предмет торгов осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. На единственного участника распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

Для участия в аукционе приглашаются резиденты РБ и нерезиденты РБ, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, предоставили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Аукцион состоится 30.09.2024 в 15.00** по адресу: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи заявления и документов: с 28.08.2024 в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4).

Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов **27.09.2024 до 17.30.** Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с имеющейся документацией на предмет торгов, а также возможность осмотра предмета торгов на местности.

**Телефоны для справок: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.**

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**

**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации № 91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Лот № 1: складское помещение, 13,3 кв. м** (архив, инв. номер 500/D-708004816, по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, 11-7д** | |
| ***Обременение*: помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия; запрет на совершение регистрационных действий** | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 23 040,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2: грузовой седельный тягач MZKT 690610,** рег. знак AI 8486-7, 2010 г. в., по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 17 | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 24 990,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов. Запрет совершения регистрационных действий будет снят продавцом в установленном законодательством Республики Беларусь порядке после проведения результативных торгов и подписания договора купли-продажи с победителем аукциона либо претендентом на покупку | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2024 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 06.09.2024.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 05.09.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by** | |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «НИИ Белгипротопгаз»** на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**.

Аукцион состоится **13.09.2024 в 14.00** по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

**Лот № 1:**

Буровая установка AMUR 531300 PBU-2-102, на шасси автомобиля ЗИЛ-131, кузов (рама) № X0B5952PA70001288, X9153130060053232.

Начальная цена с НДС 20 % – 26 640,00 руб.

**Место нахождения**: г. Минск, ул. Стебенева, 14.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту** «Многоквартирные жилые дома в границах Логойского тракта, ул. Волгоградской, Кнорина, Севастопольской». **2-я очередь строительства. Жилой дом № 3 по генплану, гараж-стоянка открытого типа № 6 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями. 1 пусковой комплекс,** ***опубликованную в газете «Звязда» от 25.07.2023 № 141(30021)***

1. В пункте 2 проектной декларации «Сведения об этапах строительства и сроках его реализации, сроке приемки в эксплуатацию» предложение «Начало выполнения работ – июль 2023 г., ввод объекта в эксплуатацию, с учетом нормативного срока строительства, переносов, приостановок – июль 2024.» заменить на «Начало выполнения работ – июль 2023 г., ввод объекта в эксплуатацию, с учетом нормативного срока строительства, переносов, приостановок – октябрь 2024».

2. Подпункт 3.2. пункта 3 проектной декларации изложить в новой редакции:

«3.2. Стоимость строительства (цена договора) 1 $м^2$ жилых помещений составляет 2 359,79 (две тысячи триста пятьдесят девять рублей 79 копеек)».

УНП 190580566

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит первые публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия «Юколанефть»

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС*, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728), на общую сумму 39 876,99 бел. руб. | 39 876,99 | 1 993,85 | 3 987,70 |
| 2 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458), на общую сумму 2 745,88 бел. руб. | 2 745,88 | 137,29 | 274,59 |

*Торги назначены на* ***30.09.2024 г. в 10.30*** *по адресу:* ***г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)****. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до* ***27.09.2024 г.*** *включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22,УНП 192140296 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info»

** Окончательная цена лота включает НДС по ставке 20 %*

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

У фармаце дыялогу

# ЗБЕРАГАЦЬ ПРЫРОДУ — ЛЮБІЦЬ РАДЗІМУ

**Кожны год у часы летніх канікул дзейнічае інфармацыйна-адукацыйная акцыя «КРОК да поспеху». Кожны год маладыя людзі могуць праз размовы з палітычнымі і грамадскімі дзеячамі, навукоўцамі, работнікамі СМІ і мастацтва атрымаць уяўленне пра розныя прафесіі, задумацца пра самаразвіццё і сваю будучыню. Зрабіць крок да аднаго з самых важных выбараў у жыцці.**

**У сярэдзіне жніўня такі шанц выпаў выхаванцам аздараўленчага лагера РУП «Віцебскэнерга» «Энергетык». У госці да іх завітала галоўны рэдактар грамадска-палітычнага, навукова-папулярнага часопіса «Родная прырода», публіцыст Александрына ПАРШЫНА.**

Прадстаўнік рэдакцыі расказала падлеткам пра нашу дзівосную прыроду і яе ўнікальныя куткі, гісторыю свайго выдання, этапы стварэння нумара, крыніцы інфармацыі і асаблівасці работы з ёй. Маладыя людзі даведаліся, як складаюцца артыкулы і рубрыкі, падбіраецца ілюстрацыйны матэрыял, каментарыі спецыялістаў і навукоўцаў. Па словах Марыі, адной з юных удзельніц сустрэчы, яна ніколі не задумвалася, як нараджаецца навіна ў газеце або часопісе.

— Мне падавалася, што гэта проста: журналіста паклікалі на нейкае мерапрыемства, усё паказалі, а ён гэта пераказаў, як мы на занятках. Аказваецца, гэта толькі кавалак працы. Артыкул пачынаецца з інфападставы — пэўнага цікавага факта, падзеі, нават з паведамлення ў іншых СМІ. Каб знайсці зачэпку, якая будзе разгорнута ў навіну, журналіст павінен увесь час маніторыць сацыяльныя сеткі, тэлеграм-каналы і сайты інфармацыйных агенцтваў накшталт БелТА, наведваць канферэнцыі і форумы, розныя тэматычныя сустрэчы, асабліва калі працуе ў пэўнай сферы. Да таго ж кожны такі факт абавязкова правяраецца на фэйкавасць. Гэта ж колькі розных інфармацыі вымушаны праглядаць карэспандэнты, — узрушана пракаментавала дзяўчынка і, трохі саромеючыся, прызналася, што вырашыла паспрабаваць напісаць некалькі нататак у раённую газету.

**На старонках часопіса «Родная прырода» друкуюцца матэрыялы аб актуальных падзеях прыродаахоўнай тэматыкі, экатэхналогіях, жывёльным і раслінным свеце нашай краіны, яе ўнікальных прыродных аб'ектах і тэрыторыях. Выходзіць дадатак «Юны натураліст», накіраваны на экавыхаванне дзяцей і падлеткаў, асвятленне дзейнасці ўстаноў адукацыі, якія ўдзельнічаюць у праектах «Зялёныя школы» і «Зялёныя класы беларускай сталіцы».**

Александрына Паршына падзялілася таксама некаторымі планамі наконт пашырэння кантэнту выдання. Напрыклад, у хуткім часе з'явяцца рубрыкі, прысвечаныя вывучэнню слядоў жывёл і птушак, незвычайным праектам Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, асобам, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё прыродазнаўчых навук і ахову навакольнага асяроддзя. Знойдзецца месца і для гумару ад маці-прыроды, прычым чытачы часопіса змогуць узяць актыўны ўдзел у напаўненні старонкі: апрача літаратурных гумарэсак і экаанекдотаў тут будуць карэкатуры, вясёлыя фота і гісторыі, дасланыя аматарамі прыроды. Дарэчы, запрашэнне далучыцца да гэтай справы атрымалі і выхаванцы лагера. Прапанова выклікала ў аўдыторыі цікавасць.

Расказала галоўны рэдактар і пра свой шлях прафесійнага станаўлення, спецыфіку прафесіі журналіста, які піша пра сферу экалогіі і турызму, неабходныя якасці для працы ў газеце і часопісе. З гумарам адказала на мудрагелістыя пытанні падлеткаў: пра цяжкасці, з якімі сутыкаецца на пасадзе, самыя хвалюючыя моманты, зваротную сувязь.

— Кожны нумар — маленькае жыццё са сваімі смешнымі і самотнымі гісторыямі, выклікамі. Часам пры планаванні задумваецца адзін змест, а жыццё ўносіць карэктывы... Складаная, але надзвычайна цікавая living рознабаковая дзейнасць. За кожнай прыгожа аздобленай вокладкай — шматлікія дамовы з установамі і аўтарамі артыкулаў, сустрэчы, камандзіроўкі, вялікая праца і адказнасць. Амаль 24/7 у пастаянным пошуку тэм для навін, сурамоўцаў, фота. Але ў гэтым і хаваецца своеасаблівы драйв, бо на тваё вочы адбываецца цуд ператварэння безлічы разрозненых фактаў у адзінае цэлае, аб'яднанае галоўнай думкай, якое нават можна патрымаць у руках, — падзялілася Александрына Паршына.




Па яе словах, вялікае значэнне мае зваротная сувязь, канструктыўныя прапановы аўдыторыі. Гэта не толькі крыніца ідэй па ўдасканальванні часопіса, але і сапраўдныя крылы натхнення для ўсёй каманды. Станоўчыя водгукі надаюць шмат энтузіязму, унутранага агню для творчасці і працы.

Напрыканцы сустрэчы галоўны рэдактар правяла цікавую мультымедыйную эквавікатарыну «Знаўца прыроды». Падчас двух тураў «Біямузыка» і «Клуб чамучак» юнакі і дзяўчаты паспрабавалі адказаць на хітрыя пытанні пра веданне птушак і жывёл, музычных і літаратурных твораў, якія маюць дачыненне да фаўны. Ці вядома, напрыклад, што птушкі могуць адразу браць дзве ноты, а чэпік-даўганос завецца балотным барашкам дзякуючы гуку, падобнаму на бэканне, які ўзнікае падчас яго палёту...

**Асноўная мэта акцыі «КРОК да поспеху» — выхаванне ў маладога пакалення патрыятызму і пачуцця гонару за Беларусь, яе дасягненні, а таксама фарміраванне матывацыі да самаразвіцця. Натхняць моладзь на здзяйсненні запрашаюцца выдатныя дзеячы культуры, мастацтва, навукі.**

Закранулі і тэму Вялікай Айчыннай вайны: частка пытанняў раскрывала ролю чатырохногіх і птушыных памочнікаў савецкіх войскаў. Так, падлеткі згадалі, які сабака паспяхова ўдзельнічаў у «рэйкавай вайне», чаму партызаны амаль не выкарыстоўвалі ў лесе коней (каб яны слядамі капытоў не выдалі карнікам размяшчэнне лагера), як цюменскія і яраслаўскія каты выратавалі зернясховішчы і музейныя калекцыі ў Ленінградзе ад нашэсця пацукоў, і іншыя пазнавальныя факты.

Удзельнікі віктарыны, якія набралі больш за ўсіх балаў, атрымалі ад рэдакцыі ўзнагароды: календарыкі, салодкія прызы і, канешне, часопіс «Родная прырода».

— Мне вельмі спадабалася наша сустрэча. Я даведаўся шмат новага пра жывёльны і птушыны свет, пра журналістаў і выданне часопісаў. Тым больш я раней чытаў «Родную прыроду». Пра яе неяк згадала наша настаўніца біялогіі. Там такія прыгожыя выявы жывёл і птушак! А яшчэ розныя эксперыменты, настольныя гульні, гісторыі пра звяроў і загадкавыя куткі Беларусі, — адзначыў выхаванец лагера віцябчанін Антон. — Цяпер я ведаю, як можна самому напісаць у нумар.




**Зоя САЛАЎЁВА.**
**Фота аўтара, аздараўленчага дзіцячага лагера «Энергетык».**

Надвор'е

# ЛЕТА РАЗВІТВАЕЦЦА ЦЯПЛОМ І СОНЦАМ

**Жнівень працягвае нарошчваць наступленне цяпла, і апошні тыдзень лета парадуе сонцам і цяплом, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Заходнія антыцыклоны, змяняючы адзін аднаго, будуць падтрымліваць у краіне пераважна сухое надвор'е. І толькі ранішнія туманы будуць нагадваць аб надыходзячай восені. У сувязі з гарачым і сухім надвор'ем узрастае пагроза лясных пажараў.**

У аўторак, 27 жніўня, будзе пераважна без ападкаў. У начны і ранішні час месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 11—17 градусаў вышэй за нуль, днём — ад 24 градусаў цяпла па паўночным захадзе да плюс 33 па паўднёвым усходзе.

У сераду таксама будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 па поўначы да плюс 19 па паўднёвым усходзе. Днём будзе 23—30 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе і поўдні — 31—33.

У чацвер, 29 жніўня, пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 12—19 градусаў вышэй за нуль, днём — ад 25 градусаў цяпла па поўначы да плюс 33 па паўднёвым усходзе.

У пятніцу і суботу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 12—19 градусаў вышэй за нуль, днём — 26—33 градусы цяпла.

Верасень таксама пачнецца з высокіх для яго тэмператур, але восьу без ападкаў ужо не абыдзецца. У нядзелю, 1 верасня, ноччу будзе пераважна без ападкаў, раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 12—19 градусаў вышэй за нуль, днём — ад 24 градусаў цяпла па паўночным захадзе да 32 па поўдні.



**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# АЛЬФА І АМЕГА ЗДАРОЎЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зрэшты, сёння прынцыпы правільнага харчавання ў Беларусі для многіх — аснова рацыёну сям'і: людзі не бяздумна паглынаюць ежу, а ўдумліва ўключаюць у сваё меню карысныя мясцовыя прадукты. У прыватнасці алеі, якія вырашаюць праблему дэфіцыту поліненасычаных тлустых кіслот і пастаўляюць у арганізм цэлы шэраг карысных рэчываў. Так, у канцэрне «Белдзяржхарчпрам» адзначаюць рост папулярнасці рапсавага алею сярод беларусаў. Таму ў апошнія гады аб'ёмы выпуску гэтага каштоўнага прадукту выраслі амаль у паўтара раза.

## У НАШАЙ КРАІНЕ І ЗА МЯЖОЙ

— За апошнія пяць гадоў аб'ёмы вытворчасці рапсавага алею павялічаны ў 1,4 раза: калі ў 2019-м мы выраблялі каля 417 тыс. тон алею, то летась — ужо 578 тыс. тон. Гэта тлумачыцца папулярнасцю дадзенага прадукту, якая працягвае расці, — распавяла **начальнік упраўлення па вытворчасці прадуктаў харчавання канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Юлія АЛЯХНО.**

У складзе канцэрна — чатыры прадпрыемствы, якія перапрацоўваюць рапсавы алей або выкарыстоўваюць яго ў вытворчасці: Віцебскі маслаэкстракцыйны завод, Гомельскі тлушчавы камбінат, Бабруйскі завод алею і Мінскі маргарынавы завод. Віцебскае прадпрыемства займаецца перапрацоўкай алею, астатнія выкарыстоўваюць яго ў вытворчасці. Пагодна-кліматычныя ўмовы даюць магчымасць вырошчваць алейнае насенне рапсу адпаведных уласцівасцяў для вытворчасці розных відаў якасней прадукцыі, расказала прадстаўнік «Белдзяржхарчпрама». Беларускі рапсавы алей адпавядае ўсім якасным характарыстыкам і праходзіць спецыяльны кантроль на ўсіх стадыях: ад алейнага насення да выпуску гатовай прадукцыі, — падкрэсліла начальнік упраўлення.

Прадукт паступова выходзіць на знешнія рынкі (па выніках 2023 года прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам» адправілі на экспарт каля 60 тон рапсавага алею). Асноўныя спажыўцы — краіны Еўропы (у прыватнасці Нідэрланды), а таксама Кітай, сказала Юлія Аляхно. Аднавіліся пастаўкі ў Ізраіль, сёння прадпрыемствы працуюць над пашырэннем геаграфіі экспарту. Хоць у першую чаргу работа алейна-тлушчавай галіны краіны накіравана на максімальнае забеспячэнне айчыннай прадукцыяй унутранага рынку, падкрэсліла спецыяліст, паколькі рапс уваходзіць у лік найбольш каштоўных харчовых культур: у яго насенні да 50 % алею і 20—28 % бялку, неабходных для здароўя і чалавека, і жывёлы.

— У краіне прынята некалькі дзяржаўных праграм, якія дазваляюць забяспечыць рынак неабходнымі вытворчымі магутнасцямі для асваення дадзенай культуры. Гэта, у прыватнасці, дзяржаўная праграма «Аграрны бізнес» на 2021—2025 гады, дзе закладзены індыкатывы, якімі кіруюцца ў тым ліку ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, — адзначыла Юлія Аляхно.

## НІЧОГА, АКРАМЯ КАРЫСЦІ

Аб карысці рапсавага алею дыетолагі і медыкі пісалі і казалі шмат. Сёння клінічныя выпрабаванні пацвярджаюць, што ўнікальны прадукт, у прыватнасці, папярэджвае развіццё паталогій сардэчна-сасудзістай сістэмы ў людзей з залішняй масай цела. Пра гэта паведаміла **навуковы супрацоўнік аддзела тэхналогій кандытарскай і алейна-тлушчавай прадукцыі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні Ганна ПЧЭЛЬНІКАВА.**

У нашай краіне вывучэнне рапсавага алею як каштоўнага прадукту для правільнага харчавання і аздараўлення пачалося ў



**У нашай краіне вывучэнне рапсавага алею як каштоўнага прадукту для правільнага харчавання і аздараўлення пачалося ў 2000 годзе, калі была створана група па алейна-тлушчавай галіне. За гэтыя гады Навукова-практычны цэнтр стаў распрацоўшчыкам асноўных дзяржаўных стандартаў на насенне рапсу і яго алей, якія ўстанаўліваюць патрабаванні як да тэхнічнага, так і да харчовага алею. Беларускімі прадпрыемствамі разам са спецыялістамі НПЦ па харчаванні распрацаваны шэраг рэцэптур маргарынаў, спрэдаў, маянэзнай прадукцыі, алейна-раслінных сумесяў.**

2000 годзе, калі была створана група па алейна-тлушчавай галіне. За гэтыя гады Навукова-практычны цэнтр стаў распрацоўшчыкам асноўных дзяржаўных стандартаў на насенне рапсу і яго алей, якія ўстанаўліваюць патрабаванні як да тэхнічнага, так і да харчовага алею. Беларускімі прадпрыемствамі разам са спецыялістамі НПЦ па харчаванні распрацаваны шэраг рэцэптур маргарынаў, спрэдаў, маянэзнай прадукцыі, алейна-раслінных сумесяў.

— Іх можна ўбачыць на прылаўках нашых крам, — падкрэсліла Ганна Пчэльнікава.

Буйныя дзяржаўныя вытворцы выпускаюць толькі рафінаваны дэзадараваны раслінны алей, які ўніверсальны: падыходзіць і для цеплавой кулінарнай апрацоўкі, і для запраўкі салатаў. Беларускі рапсавы алей поўнасцю адпавядае сучасным міжнародным патрабаванням, звярнула ўвагу прадстаўнік НПЦ. Больш за тое, для айчыннай прадукцыі прадугледжаны больш жорсткія крытэрыі

**«За апошнія пяць гадоў аб'ёмы вытворчасці рапсавага алею павялічаны ў 1,4 раза: калі ў 2019-м мы выраблялі каля 417 тыс. тон алею, то летась — ужо 578 тыс. тон. Гэта тлумачыцца папулярнасцю дадзенага прадукту, якая працягвае расці».**

ўтрымання, у прыватнасці, эрукавай кіслаты. Асабліва ў алеі прэміум-марак, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці дыетычных прадуктаў і прадуктаў з маркіроўкай «для дзіцячага харчавання».

Менавіта з-за эрукавай кіслаты калісьці рапсавы алей выклікаў сумневы і ў дыетолагаў, і ў спажыўцоў. Сёння ўтрыманне гэтага рэчыва строга рэгламентуецца, створаны і выкарыстоўваюцца ў Беларусі пераважна нізкаэрукавыя і безэрукавыя сарты рапсу. І па гэтым паказчыку алей рапсу не можа лічыцца ў якой-небудзь ступені шкодным, адзначыла спецыяліст.

— Рапсавы алей шырока ўжываюць для кандытарскіх вырабаў, у прыватнасці пры вытворчасці пернікаў і печыва, — дадала Ганна Пчэльнікава. — Супрацоўнікі цэнтра распрацавалі новыя віды пячэння са збалансаваным вугляводным складам, дзе рапсавы алей уваходзіць у асноўны тлушчавы кампанент разам са сметанковым маслам. Гэтае печыва рэкамендавана для дзіцячага харчавання.

## ЕШ І... МАЛАДЗЕЙ!

Два гады таму НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні і РНПЦ «Кардыялогія», а таксама Беларускі дзяржаўны універсітэт харчовых і хімічных тэхналогій правялі клінічныя выпрабаванні. Мэтай было вызначыць уплыў на чалавечы арганізм увядзення ў рацыён рапсавага і сланечнікавага алеяў, алейна-раслінных сумесяў са збалансаваным тлушчавым і кіслотным складам (рапсавы, сланечнікавы, ільняны алеі). У даследаваннях бралі ўдзел дзве групы добраахвотнікаў: здаровыя людзі (сярэдні ўзрост — 19 гадоў) і людзі з павышанай масай цела (сярэдні ўзрост — 52 гады). Аказалася, што для людзей з залішняй масай цела алей рапсу валодае выяўленым антыатэрагенным дзеяннем:

— Яго спажыванне папярэджвае развіццё паталогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы. Таксама мы назіралі зніжэнне ўзроўню агульнага халестэрыну і паляпшэнне абмену рэчываў, — растлумачыла Ганна Пчэльнікава. — Цікава, што на здаровых добраахвотнікаў станоўча паўплывала сумесь алеяў. Пры гэтым сланечнікавы алей не прадэманстраваў пазітыўнага ўплыву на добраахвотнікаў абедзвюх груп.

Ніводны алей па сваім тлушчакіслотным складзе не ідэальны, расказала **загадчыца лабараторыі вывучэння статусу харчавання насельніцтва НДІ гігіены, таксікалогіі, эпідэміялогіі, вірусалогіі і мікрабіялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Наталля ЦЭМБАРЭВІЧ.** Менавіта таму ў рацыён важна ўводзіць адразу некалькі відаў раслінных алеяў. Але рапсавы сярод іх павінен быць абавязкова: гэта наймагутнейшы антыаксідант, які запавольвае старэнне. Унікальны прадукт нармалізуе абмен рэчываў і зніжае халестэрын у крыві. Акрамя таго, алеі пастаўляюць у арганізм незаменныя (эсэнцыяльныя) тлустыя кіслоты: як ужо было сказана, яны павінны штодня паступаць з прадуктамі харчавання.

— І тут лічу дарэчным вылучыць менавіта рапсавы алей, які цалкам апраўдана набірае ўсё большую папулярнасць у Беларусі, — падкрэсліла эксперт.

Для нармальнага функцыянавання нашага арганізма важна не толькі колькасць у ежы амега-3, але і суадносіны ў ёй поліненасычаных кіслот амега-3, 6, 9. Менавіта ў рапсавым алеі поліненасычаныя тлустыя кіслоты (ліналенавая, або амега-6, і альфа-ліналенавая кіслата, або амега-3) знаходзяцца ў найбольш збалансаваных суадносінах.

## СУПЕРФУД ПА-БЕЛАРУСКУ

Менавіта таму, адзначаюць вучоныя, рапсавы алей павінен быць на стале ў кожнай сям'і. Бо дастатковае спажыванне амега-3 прыводзіць да паляпшэння дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы, павялічвае хуткасць абмену рэчываў, дабратворна адбіваецца на ўласцівасцях крыві, зніжае артэрыяльны ціск і памяншае рызыку ўтварэння тромбаў. Поліненасычаныя тлустыя кіслоты, якія змяшчаюцца ў рапсавым алеі, станоўча ўплываюць на ўсе функцыі мозгу (бо наш мозг на 60 % складаецца з тлушчаў і мае патрэбу ў крыніцах амега-3). Таксама поліненасычаныя тлустыя кіслоты нармалізуюць вытворчасць гармонаў, змяншаюць запаленчыя працэсы ў суставах, памяншаюць перыяд узнаўлення мышачнай тканкі пасля фізічных нагрузак, павялічваюць агульную цягавітасць арганізма, прыводзяць у норму апетыт і спрыяюць памяншэнню вагі, а таксама павышаюць устойлівасць арганізма да інфекцый. Дарэчы, увядзенне ў рацыён дадатковых крыніц амега-3 рэкамендуецца пры дэпрэсіі — гэта дапамагае ліквідаваць дэпрэсіўную сімптаматыку.

Рапсавы алей — яшчэ і крыніца вітаміну Е (а гэта магутны антыаксідант) і фітастэрынаў (яны з'яўляюцца ключавым структурным кампанентам клеткавых мембран і аказваюць проціатэрасклератычнае дзеянне). Нядзіўна, што гэты каштоўны прадукт рэкамендаваны медыкамі людзям ва ўзросце за 60 гадоў: 20 яго грамаў у суткі забяспечаць паступленне ў арганізм найкаштоўнейшых рэчываў, якія перашкаджаюць старэнню. Пры гэтым Наталля Цэмбарэвіч рэкамендуе часцей уключаць у рацыён нерафінаваны рапсавы алей. Ён таксама ёсць у продажы, важна толькі памятаць, што прызначаны такі алей менавіта для салатаў: смажыць на любым нерафінаваным раслінным алеі не варта.

Рапсавы алей — важны кампанент здаровага меню цяжарных жанчын, а таксама кормячых мам (умацоўвае імунітэт як маці, так і дзіцяці). І, нарэшце, ён неабходны дзецям з гадавалага ўзросту. З года да трох для малога норма рапсавага алею ў суткі — 6 г, адзначыла спецыяліст. І, вядома, важна памятаць, што ў рацыён дзяцей любога ўзросту варта ўводзіць безэрукавыя або нізкаэрукавыя сарты рапсавага алею.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**



### У тэму

**Як небанальна выкарыстоўваць рапсавы алей у хатняй кулінарыі? Ну, напрыклад, зрабіць з яго маянэз.**

— У рэцэпт уваходзяць яйка, гарчыца, раслінны алей і тыя ці іншыя дабаўкі, — распавёў «Звяздзе» **кіраўнік Гільдыі кухараў Беларусі Аляксандр ЧЫКІЛЕЎСКІ.** — Гэта можа быць воцат, а можна дадаць лімонны сок. Яйка ўбіваем у кубак, дадаём гарчыцу і пачынаем узбіваць блэндарам. У працэсе ўзбівання акуратна, тоненькім струменьчыкам дадаяце раслінны алей, напрыклад рапсавы. Можна ўзяць аліўкавы (хоць соус атрымаецца даражэйшы), можна ўзяць алей костачак вінаграду, гарбузовы алей — усё гэта надасць дамашняму маянэзу нюансы смаку.

# РЭСТАЎРАЦЫЯ ЎСМЕШКІ

## Сучасная імпланталогія здольна кампенсаваць страту сваіх «жамчужын»



**Асляпляльная белазубая ўсмешка — найлепшае ўпрыгожанне. На жаль, наватт тыя, хто сочыць за сваім здароўем, не застрахаваны ад выдалення зубоў. І ў гэтых выпадках даводзіцца шукаць замену. Стаматалогія ў нашы дні прапаноўвае розныя варыянты. Чаму дэнтальная імплантацыя — адзін з найлепшых выхадаў? Што яна сёння можа прапанаваць? Як выбраць добрага спецыяліста? Пра гэта гутарым з доктарам медыцынскіх навук, прафесарам кафедры хірургічнай стаматалогіі БДМУ, урачом — сківічна-тварным хірургам цэнтральнай раённай паліклінікі № 14 Мінска, імплантолагам Таццянай ШАВЕЛА.**

***— Таццяна Леанідаўна, для тых, хто зусім не ў тэме, растлумачце, калі ласка, што сабой уяўляе імплантат у стаматалогіі.***

— Гэта цвёрдая конусападобная структура, якая анатамічна адпавядае кораню зуба і ўстанаўліваецца ў косць або пад надкосніцу замест выдаленых зубоў. Вырабляюцца імплантаты, як правіла, з тытану — біяінертнага матэрыялу, які не падвяргаецца карозіі, не выклікае алергій, не аказвае неспрыяльнага ўздзеяння на фізіялагічную сістэму.

***— Каму і ў якіх выпадках звычайна рэкамендуюць ставіць імплантаты?***

— Як правіла, іх выбіраюць тыя, каго па розных меркаваннях не задавальняе здымны пратэз ці «мост». Сёння ёсць розныя варыянты дэнтальнай імплантацыі. Пры адтэрмінаванай імплантат ужыўляецца толькі пасля зарастання і запаўнення касцявой тканкі пустой лункі. Але нярэдка, калі зуб зламаўся, адразу выдаляюць яго корань і ў зубную альвеолу (паглыбленне) тут жа ўстанаўліваюць імплантат.

***— Ці ёсць у імплантатаў перавагі перад здымнымі пратэзамі і «мостам»?***

— 95 % пацыентаў з пухлінамі слізістай абалонкі рота — мужчыны і жанчыны, якія доўгі час насілі здымныя пратэзы, рэдка наведваюць стаматолагаў-артапедаў і не заўважылі траўм слізістай абалонкі, якія прыводзяць да развіцця анкалогіі. Імплантаты такіх пагроз не ствараюць. Яны ў прынцыпе не маюць пабочных эфектаў.

***— Што ўяўляе сабой аперацыя па ўжыўленні штучных зубоў?***

— Праводзіцца разрэз слізістай абалонкі, з дапамогай фрэз (спецыяльных прылад) фарміруецца касцявое ложа і ўкручваецца імплантат. Зверху на яго часова можна ўстанавіць фармавальнік дзяснавай манжэты. На завяршальным этапе пратэзавання ставіцца штучная каронка. Аперацыя праходзіць пад мясцовай анестэзіяй, яна зусім бязбольная. Доўжыцца ад 20 да 90 хвілін. За-



Фота з адкрытых крыніц.

**«Пры ўстаноўцы дэнтальных імплантатаў заўсёды ўлічваюцца спадарожныя захворванні, стан прыкусу, гігіены рота, слізістай абалонкі. Калі ў роце шмат зубнога налёту, камянёў, то імплантат, напэўна, не прыжывецца. Вельмі высокая рызыка гэтага і ў пацыентаў, у касцявой тканцы якіх прысутнічае хелікабактар пілары — бактэрыя, якая інфіцыруе розныя вобласці страўніка і дванаццаціперснай кішкі».**

пэўніваю вас: часам выдаліць зуб значна складаней, чым усталяваць імплантат.

***— Колькі часу прыжываецца імплантат? Гэта перыяд строгіх абмежаванняў у харчаванні?***

— Час астэаінтэграцыі залежыць ад тыпу касцявой тканкі. Іх усяго чатыры, першы — самы важны. Працэс прыжыўлення абумоўлены генетычна, паскорыць яго немагчыма. Звычайна ён доўжыцца 4—6 месяцаў. Сем дзён пасля ўстаноўкі імплантата трэба выключыць з ежы вострыя стравы і цвёрдыя прадукты. Ніякіх іншых абмежаванняў няма. Самае важнае ў гэты перыяд — захаванне гігіены рота.

***— У якіх выпадках імплантаты могуць не прыжыцца?***

— Пры ўстаноўцы дэнтальных імплантатаў заўсёды ўлічваюцца спадарожныя захворванні, стан прыкусу, гігіены рота, слізістай абалонкі. Калі ў роце шмат зубнога налёту, камянёў, то імплантат, напэўна, не прыжывецца. Вельмі высокая рызыка гэтага і ў пацыентаў,



у касцявой тканцы якіх прысутнічае хелікабактар пілары — бактэрыя, якая інфіцыруе розныя вобласці страўніка і дванаццаціперснай кішкі. З-за таго, што з надыходам клімактэрычнага перыяду дрэнна пачынае ўсмоктвацца кальцый, імплантат можа адрывацца ў жанчын, старэйшых за 50 гадоў, але ў гэтых выпадках праблема звычайна вырашаецца.

***— Дарэчы, аб узросце. Часам зубы могуць страціць і дзеці з-за сваёй высокай актыўнасці. Але ім жа імплантацыя не паказана?***

— Згодна з пратаколамі, гэтая аперацыя дазволена з 18 гадоў, калі сфарміравана касцявая тканка, прыкус. У мяне быў 18-гадовы пацыент, які зваліўся з веласіпеда і выбіў зуб. У такіх выпадках маладыя людзі звычайна прыносяць свае «жамчужыны», я вяртаю іх на месца, і яны, як правіла, выдатна прыжываюцца. Але той хлопец не знайшоў свой зуб — прыйшлося ставіць штучны.

***— Якім быў ваш самы ўзроставы пацыент?***

— 76-гадовы мужчына. У яго не трымаўся здымны пратэз. Мы ўстанавілі яму па два імплантаты на верхнюю і ніжнюю сківіцы і зафіксавалі на іх пратэз.

***— Ці бывае такое, што ў аднаго і таго ж чалавека адзін імплантат прыжываецца, а іншы — не?***

— Вядома. Касцявая тканка ў сківіцы па сваёй структуры розная. У франтальным аддзеле яна больш шчыльная, чым на бакавых участках, уверсе — друзлая. Часам у здаровых пацыентаў на ніжняй сківіцы з імплантатамі праблем з астэаінтэграцыяй няма, а на верхняй узнікаюць. Дэнтальныя імплантаты ўкручваюцца ў косць з вызначанай сілай — 40 Н/см². Тыя, якія ставяцца з нармальным ціскам, прыжываюцца, а пры залішнім, які выклікае перагрузку касцявой тканкі, — не.

***— Чытала, што перад дэнтальнай імплантацыяй курцы павінны ўстрымлівацца ад цыгарэт. Чаму?***

— Так, такое патрабаванне ёсць. І часта ў яго самыя прыемныя наступствы. Пасля некалькіх месяцаў устрымання ад згубнай звычкі пры падрыхтоўцы да ўста-

**«95 % пацыентаў з пухлінамі слізістай абалонкі рота — мужчыны і жанчыны, якія доўгі час насілі здымныя пратэзы, рэдка наведваюць стаматолагаў-артапедаў і не заўважылі траўм слізістай абалонкі, якія прыводзяць да развіцця анкалогіі. Імплантаты такіх пагроз не ствараюць. Яны ў прынцыпе не маюць пабочных эфектаў».**

ноўкі імплантатаў многія пацыенты ўжо да яе не вяртаюцца. Курэнне ва ўсіх адносінах шкоднае. Яно выклікае спазм буйных і дробных сасудаў, што прыводзіць да недахопу кіслароду і сілкавання. У тых, хто пакутуе на нікацінавую залежнасць, пасля выдалення зуба, як правіла, развіваецца альвеаліт — запаленне ў зубной альвеоле. Гэта супрацьпаказанне для імплантацыі.

***— Чым кіруецеся пры выбары імплантатаў?***

— Выбіраю тыя, у якіх сучасныя наборы фрэз для апрацоўкі касцявой тканкі. Чым менш траўматычнасці пры аперацыі, тым лепш прыжываецца імплантат. Мы ўстанаўлівалі беларускія вырабы, выкарыстоўваем і імплантацыйныя сістэмы іншых краін. У спецыяльнай літаратуры апісаны ўскладненні, якія бываюць у імплантатаў той ці іншай фірмы, іх улічваеш у кожнай канкрэтнай сітуацыі.

***— Як доўга могуць праслужыць імплантаты?***

— Гэта нельга прадказаць загадзя. Часам верхнюю частку імплантата (каронку) мяняюць праз пяць гадоў, а часам — праз 20.

***— Вы абаранілі доктарскую дысертацыю па тэме «Дыягностыка, лячэнне і медыцынская прафілактыка перыімплантыту». Што вас падштурхнула да навуковай работы?***

— Прафесійная цікавасць. У працэсе практыкі ўзнікалі пытанні, на якія хацелася знайсці адказ. Да мяне толькі доктар медыцынскіх навук У. Л. Параскевіч абараніў дысертацыю, прысвечаную імплантатам. Я была другой. Кажу сваім студэнтам на лекцыях: «На тое, каб прачытаць лекцыю, якая доўжылася адну гадзіну, мне спатрэбілася 20 гадоў працы. Вам ужо лягчэй, вы павінны стаць спецыялістамі, лепшымі за мяне, і рухаць навуку далей. Гэта шлях прагрэсу».

***— Таццяна Леанідаўна, да вас, спецыяліста з доктарскай ступенню, напэўна, часта накіроўваюць складаных пацыентаў. Падзяліцеся якімі-небудзь няштатнымі прыкладамі...***

— У мяне былі цалкам бяззубыя пацыенты. Разам з урачом-стаматолагам-артапедам вызначалі колькасць і месца ўстаноўкі і ў залежнасці ад прыкусу ўжыўлялі ім 6–8 імплантатаў. Аднойчы на месца выдаленага малочнага зуба перасадзіла маладой дзяўчыне яе ж уласны пастаянны ікол, які быў дыстапіраваны (гэта значыць, займаў няправільнае становішча) на паднябенні. Зубны рад адразу эстэтычна выправіўся, і жаваць стала лягчэй. Успамінаю пацыента з сардэчна-сасудзістай паталогіяй, які прымаў антыкаагулянты. Кардыёлаг на час аперацыі адмяніў мужчыну гэтыя прэпараты. Я ўстанавіла імплантаты. Праз тыдзень ён вярнуўся да прыёму лекаў, і нечакана ў раёне барады і шыі ў яго з'явілася гематома, імплантаты не прыжыліся. Прыйшлося іх выкруціць. Але я не той чалавек, які здаецца без бою. Параілася з кардыёлагам, яна перавяла пацыента на антыкаагулянт нізкай канцэнтрацыі, і другая мая спроба завяршылася ўдала.

***— Вы ўжо больш чым 30 гадоў працуеце практычным хірургам. Ці заўважаеце ў сябе якую-небудзь прафесійную дэфармацыю?***

— Прафесія, безумоўна, накладае адбітак. Пры сустрэчы з любым чалавекам адразу міжволі зважаю на яго зубы, ацэньваю іх стан.

**«Сёння ёсць розныя варыянты дэнтальнай імплантацыі. Пры адтэрмінаванай імплантат ужыўляецца толькі пасля зарастання і запаўнення касцявой тканкі пустой лункі. Але нярэдка, калі зуб зламаўся, адразу выдаляюць яго корань і ў зубную альвеолу (паглыбленне) тут жа ўстанаўліваюць імплантат».**

***— Як знайсці добрага імплантолага? На што трэба звяртаць увагу пры выбары спецыяліста?***

— Думаю, трэба ўдакладніць, якімі аперацыямі ён валодае. Ведаю прыклады, калі імплантацыяй займаюцца тыя, хто не ўмее выдаляць зубы. Гэта вялікі мінус. Без гэтага навыку імплантаты ўдала наўрад ці паставіш. Добры спецыяліст комплексна падыходзіць да вырашэння праблемы, заўсёды думае найперш пра здароўе пацыента.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота дадзена суразмоўніцай.**

### АБСАЛЮТНЫЯ СУПРАЦЬПАКАЗАННІ ДЛЯ ІМПЛАНТАЦЫІ ЗУБОЎ:

- агульнае саматычнае захворванне ў стадыі дэкампенсацыі;
- шэсць месяцаў пасля інфаркту міякарда ці інсульту;
- парушэнні мазгавога кровазвароту;
- перанесеная аперацыя па пратэзаванні клапанаў сэрца;
- прыём імунасупрэсіўнай тэрапіі, бісфосфанатаў;
- злаякасныя пухліны сківічна-тварнай вобласці;
- перыяд прамянёвай або хіміятэрапіі;
- наркатычная залежнасць;
- псіхічныя захворванні, пры якіх пацыент самастойна не можа праводзіць гігіену рота.

### АДНОСНЫЯ СУПРАЦЬПАКАЗАННІ:

- алергія на мясцовыя анестэтыкі;
- дрэнная гігіена;
- курэнне;
- вострыя ці хранічныя запаленчыя працэсы сківічна-тварнай вобласці;
- дабраякаснае новаўтварэнне;
- цукровы дыябет.

# БЕЛАРУСЬ ШМАТАБЛІЧНАЯ: УЗАЕМАПРАНІКНЕННЕ КУЛЬТУР

**Сёння ў нашай краіне пражываюць прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў, зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных кірункаў (агульная колькасць рэлігійных арганізацый сёння — больш за тры з паловай тысячы). Як заўважыў намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Сяргей ГЕРАСІМЕНЯ, адна з асаблівасцяў нашай краіны ў тым, што ўсе жывуць у міры і згодзе, ніколі не ўзнікае міжнацыянальных канфліктаў, не фіксуецца правапарушэнняў на расавай глебе. Гэта трэба цаніць і ставіць у прыклад іншым краінам. Гаворка пра тое, што робіцца, каб захаваць такія каштоўныя адносіны, вялася ў Доме прэсы падчас прэс-канферэнцыі «Беларусь шматаблічная: узаемапранікненне культур і рэлігій».**




## ТОЕ, ШТО ЯДНАЕ

Сяргей Герасіменя згадаў пасяджэнне Міжканфесійнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, якое прайшло ў маі ў Крыжаўздзвіжанскім храме ў Масюкоўшчыне:

— Гэта ўнікальная падзея, калі прадстаўнікі розных канфесій у храме збіраюцца за круглым сталом. Тут нават ніхто не думаў пра тое, які паміж імі ёсць адрозненні, бо ўсе аб'яднаны адзінай мэтай: зрабіць так, каб іх паства, насельніцтва нашай краіны не забыла аб сваіх продках, героях, якія абаранялі і вызвалялі Беларусь.

Таксама адчуць каштоўнасць нашай культурнай і канфесійнай разнастайнасці можна было падчас мерапрыемстваў у Іўі — месцы, дзе гістарычна складвалася адметная сітуацыя, калі побач жылі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў.



Адрозненні не перашкаджалі сяброўскім адносінам, прыняцю культур, наадварот, толькі ўзбагачалі.

Нацыянальна-культурныя аб'яднанні маюць вялікую падтрымку з боку дзяржавы, створаны ўсе ўмовы для таго, каб яны маглі не толькі захоўваць здабыткі свайго народа, але і паказваць іх іншым. Творчыя калектывы далучаюцца да разнастайных канцэртаў і мерапрыемстваў, што праводзяцца ў нашай краіне. Самым жа яскравым святам, дзе можна пачуць песні, пабачыць танцы, строі, сувеніры, пакаштаваць стравы, даведацца пра гістарычныя факты, а магчыма, і чамусьці павучыцца ў прадстаўнікоў розных дыяспар, стаў Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у Гродне. Больш даведацца пра іншыя народы можна і на розных мерапрыемствах у Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур альбо калі далучыцца да рэпетыцый танцавальных калектываў (разам з прадстаўнікамі дыяспар у іх займаецца беларуская моладзь) ці нават дамовіцца з кіраўнікамі аб'яднанняў, каб тыя падзяліліся рэцэптамі нацыянальных страў.

— Можна сказаць, што ў прадстаўнікоў нацыянальна-культурных аб'яднанняў два дамы: наш цэнтр і Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Яны могуць разлічваць на фінансавую падтрымку на набыццё нацыянальных строяў, на транспарт для ўдзелу ў розных мерапрыемствах, бо творчыя нацыянальныя калектывы заўсёды з задавальненнем прымаюць у розных рэгіёнах, — расказала **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга ЯКАБСОН.**

Акрамя таго, што нацыянальна-культурныя аб'яднанні праводзяць агульныя канцэрты, дабрачынныя акцыі, яны наведваюць мерапрыемствы і святы сваіх сяброў. Разам могуць адзначаць, напрыклад, не толькі Раство, але і Наўруз, Сабантуй. Праз такое ўзаемадзеянне яны ўзбагачаюць свой кругагляд, даведваюцца пра асаблівасці культур розных народаў.

— На фестывалі нацыянальных культур, які сёлета прайшоў ў Гродне, усе маглі бачыць, якая шматаблічная наша Беларусь, як жывуць нацыянальнасці. А галоўнае, што ўсе яны — адзіная вялікая сям'я, — заўважыла Вольга Якабсон.

## «МЫ РАДЫ АДНО АДНАМУ НЕ ТОЛЬКІ НА СВЯТАХ»

— Нам вельмі добра жывецца ў нашай шматаблічнай сям'і. Мы рады адно аднаму не толькі на святах, але і калі сустракаемся ў горадзе. У сацыяльных сетках мы абмяркоўваем пытанні, якія разглядаліся на пасяджэнні кансультатыўнага савета, дзелімся праблемамі і радасцямі. Вельмі цёпла адно да аднаго ставімся. У нас ніколі нават у думках не ўзнікала, што паміж намі могуць быць нейкія звады. Добра, што ёсць вялікая падтрымка з боку дзяржавы, каб мы маглі захоўваць свае традыцыі, культуру, песні, мову. Часам можа падацца, што мы ўжо добра ведаем пра азербайджанцаў, дагестанцаў, армян і іншыя нацыянальнасці, але насамрэч мы яшчэ і паловы ўсяго таго не пабачылі, што яны могуць нам паказаць, — падзяліўся **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра» Уладзіслаў КАДЗІРА.**

— Міжнацыянальная і міжканфесійная згода — фактары стабільнасці дзяржавы... У Беларусі людзей ацэньваюць не па нацыянальных, не па рэлігійных перакананнях, а па дзелавых, прафесійных і чалавечых якасцях, таму тут мы сябе адчуваем як у сваім доме, у якім хочам, каб быў парадак, мір, дабрабыт, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага таварыства «Аястан» Георгій ЕГІЯЗАРАН.** Ён заўважыў, што ў Беларусі ў розных канфесій ёсць магчымасць для ажыццяўлення сваіх духоўных патрэб, у найбліжэйшы час яна будзе і ў прадстаўнікоў армянскай апостальскай царквы — у Мінску завяршаецца будаўніцтва храма па вуліцы Філімонава. Георгій Анушаванавіч узначальвае таксама Кансультатыўны міжэтнічны савет пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, у складзе якога сёння прадстаўлены кіраўнікі 19 нацыянальна-культурных аб'яднанняў. Савет абмяркоўвае актуальныя пытанні міжнацыянальных адносін, арганізоўвае агульныя праекты, садзейнічае захаванню і ўмацаванню міжнацыянальнай згоды ў Рэспубліцы Беларусь, інтэграванню грамадзян розных нацыянальнасцяў і фарміраванню ў грамадстве прызнання таго, што ўсе нацыянальныя супольнасці з'яўляюцца неад'емнай часткай народа Рэспублікі Беларусь. Сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур прадстаўнікі нацыянальных арганізацый праводзяць мерапрыемствы, прымеркаваныя да знакавых падзей, свят, якія маюць гістарычнае значэнне, такіх як Дзень Перамогі, Дзень памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, Дзень Незалежнасці, Дзень народнага адзінства. Нацыянальна-культурныя аб'яднанні далучаюцца да рэспубліканскіх акцый «Нашы дзеці», «Тыдзень лесу», ездзяць з дабрачыннымі канцэртамі на Дзень абароны дзяцей. Акрамя таго, дыяспары праводзяць і ўласныя культурныя і патрыятычныя праграмы. Так, армяне штогод наведваюць Брэсцкую крэпасць, наладжваюць кантакты з навучальнымі ўстановамі, калі ў студэнтаў розных навучальных устаноў ёсць магчымасць больш даведацца пра армянскую культуру, прычым танцавальныя нумары і майстар-класы праводзяць равеснікі.

**Старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Гаро» Хізры АСАДУЛАЕЎ** расказаў, што арганізацыя вырашыла зрабіць акцэнт на работу з беларускай моладдзю, маўляў, дагестанцы, якія жывуць тут, і так павінны ведаць сваю культуру і гісторыю, тым больш што прадстаўнікі гэтага народа не так даўно пачалі абжывацца на беларускай зямлі, пераважна ў пасляваенныя гады:

— Мы можам паказаць сваю культуру са сцэны, але гэта не знішчае дыстанцыі. А калі беларуская моладзь людзі танцуюць лезгінку і для іх знаёмства з нашай культурай становіцца таксама нечым патаемным, ідзе збліжэнне душ.

Перад прадстаўнікамі іншых народаў, на думку Хізры Газіевіча, асаблівая адказнасць: «Калі я зраблю нешта дрэннае ў Дагестане, гэта будзе выключна мая правіна, калі ж у Беларусі — на гэта паглядзяць як на дрэнны ўчынак дагестанца (тое ж самае з прадстаўнікамі іншых народаў)». Адсюль і жаданне паказваць усё самае лепшае. У той жа час любоў да радзімы абуджае і любоў да Беларусі, якая таксама стала домам. Хізры Газіевіч упэўнены, што менавіта тут ён сфарміраваўся як асоба, бо прыехаў сюды яшчэ зусім маладым, як толькі атрымаў дыплом. У Беларусі яго таленты змаглі раскрыцца напоўніцу. Ствараючы творы тут, ён атрымаў званні народнага мастака Дагестана і Чачэнскай Рэспублікі, у Беларусі адзначаны медалём Францыска Скарыны. А яшчэ ён лічыцца заснавальнікам сучаснай карацінскай літаратуры як носьбіт вельмі рэдкай, занесенай у Чырвоную кнігу Расіі мовы. Вершы Асадулаева былі перакладзены на беларускую мову Рыгорам Барадуліным, а на рускую — Анатолем Аўруціным. Літаратурны талент быў высока ацэнены — Дзяржпрэміяй Дагестана імя Расула Гамзатава. Хізры Газіевіч упэўнены, што дасягнуў поспехаў дзякуючы менавіта тым раўнапраўным адносінам і падтрымцы, якую маюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў у Беларусі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ВАЙНА ВІКТАРА АРЦЁМ'ЕВА



**Віктар Іванавіч вядомы ў Магілёве і за яго межамі публіцыст, паэт, краязнаўца. Ён аўтар некалькіх дзясяткаў кніг, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат літаратурнай прэміі імя Якуба Усікава Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, бібліёграф паэта Аляксея Пысіна. Вайна для тады яшчэ 14-гадовага хлопчыка стала выпрабаваннем на трываласць характару, сілу волі і мужнасць. Самыя яркія эпізоды ваеннага дзяцінства ляглі ў аснову некалькіх яго зборнікаў пра вайну. Мы сустрэліся з Віктарам Іванавічам, каб разам яшчэ раз пагартаць гэтыя кніжкі, праглядзець яго сямейны альбом з даваеннымі фота і ўспомніць найбольш яскравыя эпізоды яго жыцця.**

## ЧОРНЫЯ КРЫЖЫ НАД ВЁСКАЙ

Віктар Арцём'еў нарадзіўся ў 1927 годзе на хутары Чарэйцаў Круг Шклоўскага раёна. У сям'і Маўры Мітрафанаўны і Івана Лукіча было шасцёра дзяцей, апошні Анатоль нарадзіўся ўжо пасля вайны. Разам з сям'ёй жыла і бабуля Хадора — бацькава цешча ад першага шлюбу. Усе яе дзеці паўміралі, і яна засталася адна. Іван Лукіч пашкадаваў старую і забраў да сябе. Яна выгадавала яго дзяцей як родных.

Вёска Радзішына, дзе нарадзіўся будучы публіцыст, мела ўсяго 55 двароў. Але дзяцей было многа, сумаваць не прыходзілася. З маленства кожны ўжо ўмеў працаваць. Віктар Іванавіч успамінае, што з 4-5 класа пасвіў у калгасе авечак, свіней. Калі падрос, займаўся конькмі. Даглядаў і вельмі любіў на іх катацца. З 12-13 гадоў умеў запрагаць каня і перавозіў снапы з калгаснага поля. Летам у калгасе працавалі ўсе. А па вечарах моладзь збіралася ў кагосьці ў хаце і танцавала пад гармонік або пад скрыпку музыканта па прозвішчы Клычок з суседняй вёскі.

Чытаць Віктар навучыўся рана. Бацька выпісваў яму газету «Піянер Беларусі», а сабе — «Камунар Магілёўшчыны» і «Звязду». Іх малы таксама чытаў. Дзіцячая памяць зафіксавала, што перад вайной часта на вочы трапляла паведамленні пра палітычнае напружанне з Германіяй. Але ўсе былі перакананы, што калі вайна і будзе, то не на нашай тэрыторыі. Як пелася ў песні: «сваёй і кавалачка не аддадзім».

У дзень, калі пачалася вайна, Віктару і яго аднагодкам па Ардацкай сямігодцы павінны былі ўручыць пасведчанні аб заканчэнні школы.

— Дзень быў прыгожы: ясны, сонечны, ціхі. І настрой — такі ж, — успамінае Віктар Іванавіч. — На выпускны вечар усе дзяўчаты і хлопцы прыйшлі загадзя, святочна апранутыя. Нас было не больш за дваццаць чалавек. Калі ў прызначаны час не запрасілі на ўручэнне, ніхто асабліва не хваляваўся. Да райцэнтра, адкуль павінны былі прывезці атэстаты, 27 кіламетраў, затрымка ў дарозе — рэч звычайная. Аднак хутка стала вядома прычына — вайна. Пасведчанні выпускнікам усё ж такі ўручылі, але толькі ўвечары. Настаўнікі былі сумныя, сціпла павіншавалі нас і запрасілі за стол. Побач з ежай і цукеркамі стаялі бутэлькі з гарэлкай і віном. Настаўнікі налілі сабе і нам: юнакам — крыху гарэлкі, дзяўчатам — на донцы віна. Гэта была наша апошняя з імі сустрэча. З настаўнікаў-мужчын у вёску Ардаць ніхто з вайны не вярнуўся. Чуў толькі, што дырэктар школы Якаў Крупень застаўся жывы, пасля вайны працаваў у Чарнаручы.

## ЖЫЦЦЁ Ў ТЫЛЕ

Калі ў Радзішыне праводзілі мужчын на вайну, пелі «Последний нонешний денечек гуляю с вами я, друзья...» Бабы галасілі, дзеці спалохана назіралі за тым, што адбывалася. Гаспадар сямейства Арцём'евых Іван Лукіч быў мужчына ўжо непрызыўнога ўзросту, яму споўнілася 50 гадоў, аднак ён добраахвотнікам уступіў у 810-ы працоўна-будаўнічы дарожны батальён, які браў удзел у абароне Смаленска і Масквы. Але ўжо ў пачатку 1942 года Дзмітраўскі райваенкамат Масквы дэмабілізаваў яго па інваліднасці. Вярнуцца бацька змог толькі пасля вайны.

— На пяты ці шосты дзень вайны мы з маці пайшлі ў сяло Гарадзішча за сем кіламетраў ад нас, каб у краме купіць солі, мыла і запалак, — расказвае Віктар Іванавіч. — Маці казала, што хутка нічога нельга будзе набыць, нават за грошы. Яна гэта ведала яшчэ па Грамадзянскай вайне. Калі мы вярталіся дадому, з боку Шклова ледзь ці не над нашымі галовамі праляцеў самалёт з чырвонымі зоркамі на фюзеляжы, з кабіны нават было відаць галаву лётчыка ў шлеме. Следам за ім пранёсся нямецкі самалёт з чорнымі крыжамі. А хутка пачулася кулямётная стральба. Самалёты былі ўжо далёка ад нас, і я не адразу зразумеў, які з іх палыхнуў. Убачыў, як з яго выскачылі два лётчыкі. Па іх таксама ўдарыла кулямётная чарга. Спадзяваўся, што гэта нашы немцаў падбілі, але хутка высветлілася, што наадварот.

## ПАД АКУПАЦЫЯЙ

— Вораг наступаў, і паступіла каманда пераганяць жывёлу на ўсход, каб ворагу не дасталася, — успамінае суразмоўнік надыход немцаў. — Мне з таварышамі даручылі пераганяць статак з Радзішына ў Чэрнеўку. Там мы перадалі яго супрацоўнікам сельсавета і вярнуліся дамоў. Але, як потым стала вядома, жывёлы загінулі, бо вораг ужо перарэзаў шляхі адступлення.

Фронт праз вёску Радзішына не праходзіў. Толькі разрозненыя групы чырвонаармейцаў з воінскіх часцей, якія былі разбіты на Бярэзінскім і Дняпроўскім рубяжах, рухаліся на ўсход. Стомленыя, галодныя, у запыленым адзенні, яны прасілі піць і што-небудзь з яды. Жанчыны выносілі ім малако і хлеб.

Аднойчы з боку вёскі Старыя Чамаданы, што за сем кіламетраў ад Радзішына, пачулася страляніна, успыхнула вялікае зарыва. Потым вясковыя жанчыны расказвалі, што сустрэлі каля ракі стомленага чырвонаармейца, які расказаў, што адбыўся няроўны бой за вёску. Параненых і кантужаных чырвонаармейцаў немцы загналі ў вялікую адрыну і падпалілі. Толькі адзінкам удалося выратавацца.

— Праз дзень ці два пасля трагічных падзей у Старых Чамаданах з'явіліся першыя акупанты і ў Радзішыне, — расказвае Віктар Іванавіч. — У мяне былі невялікія партрэты Леніна і Сталіна, трымаць якія навідавоку было небяспечна, і я вырашыў іх схаваць. Сцены ў хаце былі абклеены газетамі, а пад столлю мелася невялічкая пустэча, куды я і паклаў тыя партрэты. А каб схованка выпадкова не адкрылася, наляпіў зверху яшчэ і газету. Ні паліцаі, ні немцы, якія заходзілі ў хату, нічога не западозрылі. Пра схованку не казаў нават маці. Як толькі сяло вызвалілі, дастаў партрэты і размясціў іх на бачным месцы. Хтосьці можа падумаць: а ў чым тут подзвіг? А я лічу, што ў 14 гадоў на такі ўчынак патрэбны і сумленне, і кемлівасць, і нават мужнасць.

Калі ў Ордаці, а гэта чатыры кіламетры ад Радзішына, адкрылі нямецка-паліцэйскі гарнізон, рэпрэсій стала больш. У склад гарнізона ўвайшлі акружэнцы, якія перайшлі на бок ворага. Гэтыя пярэваратні не пераставалі марадзёрстваваць.

У лютым 1944 года немцы выгналі радзішанцаў з дамоў — збіраліся зрабіць у гэтым месцы «мёртвую зону» для партызан. Хто паспеў, схаваўся, астатніх пагналі спачатку ў Аршанскі канцлагер, а пасля ў Круглянскі раён у вёску Ражкі. Сям'я Арцём'евых жыла там каля пяці месяцаў да самага вызвалення іх вёскі. Гэтай тэме Віктар Арцём'еў прысвяціў кнігу «Выгнаннікі».

## ВЫЗВАЛЕННЕ ПРЫЙШЛО З УСХОДУ

У адной з кніг Віктар Арцём'еў гэты доўгачаканы момант апісаў так: «Вызваленне ад акупантаў адбылося ў ноч з 27 на 28 чэрвеня 1944 года. Спачатку пачалася страляніна ў Круглым, потым над пасёлкам успыхнула зарыва. Крыху пазней загарэліся хаты ў вёсцы Александроў, дзе размяшчаўся нямецка-паліцэйскі гарнізон. Выразна пачуліся аўтаматныя і кулямётныя чэргі, выбухі гранат. Людзі, якія падышлі з таго боку, перадалі, што на гарнізон пайшлі штурмам партызаны, а Круглае ўжо ўзята. Гарэлі хаты ў вёсцы Радча, што за рэчкай Друць. Іх запалілі немцы, якія адступалі на захад. Да Ражкоў ні немцы, ні паліцаі не дабраліся. Вёска ўцалела. Радасць перапаўняла ўсіх цераз край: нашы прыйшлі! Праз тры дні мы вярнуліся дамоў».

— У 1944 годзе, пасля вызвалення, мяне прызвалі ў армію, — расказвае суразмоўнік. — Праходзіў падрыхтоўку ў Фашчаўцы — там быў арганізаваны збор. Вучылі страляць. Рыхтавалі ў пяхоту. Але паваяваць не атрымалася. Ваенкам у Шклове паглядзеў на мяне — а я быў ростам 156 сантыметраў і важыў 40 кілаграмаў — і параіў паменшыць сабе гадоў. Я адмовіўся, але ў Магілёве ўсё ж такі мяне і некалькіх маіх таварышаў камісавалі і адправілі дадому, каб падраслі.

Радзішына пакрысе вярталася да мірнага жыцця. У калгасе працавалі сеяць хлеб, касіць сена. Віктар працаваў на ворыве, дапамагаў сеяць лён. Трэба было падтрымаць вялікую дзяржаву, паклапаціцца, каб яна была з хлебам. Працавалі шмат, але было галаднавата. У двух сялян пасля вайны не засталося ні кароў, ні свіней, ні цялят. Нават сабак і тых перастралялі. Немцам не падабалася, што яны сустракалі іх брэхам, а партызанам — тое, што яны выдавалі іх ворагу.

## З ПЫСІНЫМ СЯБРАВАЛІ СЕМ'ЯМІ

Яшчэ ў 1 класе настаўніца звярнула ўвагу на літаратурны талент юнага Віктара Арцём'ева. Яна прапанавала хлопчыку напісаць заметку ў газету, крыху паправіла, і тэкст надрукавалі. У другім і трэцім класах Віктар ужо быў членам рэдкалегіі, а ў чацвёртым стаў рэдактарам школьнай газеты. У сямігодцы, а потым і культасветвучылішчы працягваў развіваць свае пісьменніцкія здольнасці. У артыкулах крытыкаваў дрэнных вучняў, гультаёў, курцоў, а сумленных хваліў і ставіў у прыклад.

Пасля вайны Віктар Арцём'еў скончыў у Мінску вячэрні ўніверсітэт марксізму-ленінізму, атрымаў вышэйшую палітычную адукацыю. Успамінае, што лекцыі ім чыталі вядомыя прафесары, а за вучэбнымі сталамі сядзелі дырэктары буйных прадпрыемстваў. У 1964 годзе суразмоўнік паступіў у Мінскі педінстытут імя Горкага на бібліятэчны факультэт, дзе загадчыкам кафедры быў Васіль Лявончыкаў, з якім Арцём'еў пазнаёміўся яшчэ ў Чэрыкаве.

Там жа, у Чэрыкаве, Віктар Арцём'еў пасябраваў і з Аляксеем Пысіным, які з 1955 года ўзначальваў раёнку. Віктар Іванавіч на той час быў загадчыкам аддзела культуры і сакратаром пярвічнай партыйнай арганізацыі райвыканкама. Аднойчы Пысін зайшоў да яго ў аддзел і папрасіў напісаць артыкул. Так пачалося іх супрацоўніцтва, якое потым перарасло ў сяброўства. Пысін быў вельмі ўдзячны Арцём'еву за тое, што той дапамог яму ў адной вельмі складанай жыццёвай сітуацыі.

— Аднойчы я зайшоў да Пысіна ў рэдакцыю і сустрэў там свайго земляка Георгія Лаўрынавіча Напрэева, які працаваў інструктарам ЦК КПБ, — расказвае пісьменнік. — Мы былі добра знаёмыя, нашы сем'і сябравалі. Пысіна збіраліся за адзін матэрыял звольніць і выключыць з партыі. Я папрасіў Напрэева, каб той дапамог Пысіну. У хуткім часе пасля гэтага я пераехаў у Магілёў. Чуў, што Пысіну далі вымову. Падумаў, што зямляк не дапамог. Але Пысін пры сустрэчы расказаў, што дапамог яшчэ як: яму пагражала горшае. Георгій Напрэеў таксама паклапаціўся, каб Пысіна адправілі вучыцца ў Маскву на вышэйшыя літаратурныя курсы.

— Пасля іх Пысін вярнуўся ў Магілёў, і мы сябравалі ўжо сем'ямі, — дзеліцца ўспамінамі Віктар Іванавіч. — Гэта ён фактычна прымусіў мяне стаць карэспандэнтам-арганізатарам бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Магілёве. Я спачатку супраціўляўся, а потым быў яму вельмі ўдзячны. Пабачыў шмат славутых пісьменнікаў, многія з іх сталі маімі сябрамі. Былі сустрэчы з Іванам Шамякіным, Рымай Казаковай, Фёдарам Янкоўскім, Уладзімірам Гніламёдавым, Яўгенам Далматоўскім, Віктарам Карамазавым, Алесем Махначом, Рыгорам Няхаем, Авяр'янам Дзяржынскім. За 10 гадоў работы ў якасці карэспандэнта-арганізатара зладзіў у Магілёве каля дзвюх тысяч літаратурных сустрэч. Шматкаму з іх прысвяціў свае нарысы, апісаў уражанні ад сустрэчы з імі. У друку выйшлі мае даследаванні пра беларускую мову, краязнаўчыя нататкі, успаміны пра вайну, склаў зборнік «Пісьменнікі і кнігі», тры зборнікі «Вянок», якія прысвяціў Аляксею Пысіну, Анатолю Сербантовічу і песняру зямлі Магілёўскай — Івану Пехцераву.

Дзейнасць Віктара Арцём'ева адзначана шматлікімі ганаровымі граматамі і падзякамі, ён уладальнік нагрудных знакаў «За выдатную працу» Міністэрства культуры СССР, «За вялікі ўклад у літаратуру» Саюза пісьменнікаў Беларусі. Сваю дзейнасць пачынаў у калгасе, быў загадчыкам Парыцкай раённай бібліятэкі, літсупрацоўнікам Парыцкай раёнкі, інспектарам упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама, загадчыкам аддзела культуры ў Чэрыкаве. З 1962 да 1969 года працаваў у Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. Леніна, а з 1969 года — выкладчыкам бібліятэчнага тэхнікума імя Пушкіна.

За жыццё сабраў вялікую бібліятэку, у якой шмат кніг з дарчымі подпісамі Ігара Шклярэўскага, Івана Чыгрынава, Івана Шамякіна і іншых. Асабліва дарагі для яго зборнік з вершамі пра Брэсцкую крэпасць з аўтографамі Васіля Віткі, Ніла Гілевіча, Петруся Броўкі, Петруся Макаля, Аляксея Пысіна, які яму падарылі ў рэдакцыі газеты «ЛіМ» у перыяд цеснага супрацоўніцтва з гэтым выданнем.

## ФАШЫЗМ ЗНОЎ ПАДЫМАЕ ГАЛАВУ

Нягледзячы на свае 97 паважаных гадоў, Віктар Іванавіч застаецца ў страі. Па меры магчымасці наведвае абласную бібліятэку імя У. Леніна, сустракаецца з творчай моладдзю, шмат яго ўспамінаў датычыцца ваеннага перыяду. Для сям'і Арцём'евых вайна стала вялікім выпрабаваннем.

— На вайне загінулі мае дзядзькі Макар Арцёмаў, Адам Трафімаў, наш зяць Павел Яфіменка, стрыечныя браты Васіль Арцёмаў, Мікалай Глушанкоў, — пералічвае імёны родных Віктар Іванавіч. — Акупанты знішчылі ўсю сям'ю майго дзядзькі Фёдара Глушанкова, расстралялі стрыечнага брата Ісака Пруднікава. З сям'і нашага зяця Дзмітрыя Нікіфаравіча Асіповіча на вайну пайшлі бацька і пяць сыноў, а вярнуліся толькі два сыны. У пабрацціма Міхаіла Аляксеевіча Ласоўскага на франтах загінулі тры браты. Наогул, з вайны не вярнуліся 27 маіх землякоў з Радзішына, шмат хто памёр у вёсцы ад тыфу, бо не было ні ўрача, ні лекаў.

На сустрэчах з моладдзю, магілёўчанамі Віктар Арцём'еў заўсёды звяртае ўвагу на неабходнасць берагчы мір. Сёння гэта асабліва важна.

— Фашызм зноў падымае сваё джала, — кажа ён. — Толькі ў яго верхаводаў іншыя імёны. Іх дзеянні прыкрыты «правамі чалавека» і «дэмакратыяй», а почырк той жа, гітлераўскі. Дастаткова ўспомніць падзеі ў Югаславіі, разгром Сербіі і анексію Косава, цынічную вайну ў Іраку, каляровыя рэвалюцыі на тэрыторыі былога Савецкага Саюза і ва ўсім свеце, памкненні развязаць вайну ў Паўночнай Карэі, Іране... З маўклівай згоды дзяржаў Заходняй Еўропы густымі ўсходамі прабіваюцца парасткі фашызму ў суседніх з намі краінах. Апаганьваюцца і разбураюцца помнікі пераможцам над фашысцкай Германіяй, а былыя памагатыя эсэсаўцаў узводзяцца на п'едэстал. Нельга дапусціць, каб гэта чума распаўсюдзілася на ўвесь свет і запаланіла яго. Трэба берагчы сваю краіну і цвёрда супрацьстаяць карычневай навале.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# «НА ГЛЕБЕ НАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ...»

## Ці лёгка займацца літаратурным краязнаўствам

**Алесь ХІТРУН — вядомы на Гродзеншчыне збіральнік гістарычнай, літаратурнай памяці. Больш за дзесяць гадоў працуе навуковым супрацоўнікам Лідскага гістарычна-мастацкага музея, з'яўляецца куратарам Дома Валянціна Таўлая — адмысловага філіяла Лідскага музея. Некаторы час узначальваў літаратурнае аб'яднанне «Суквецце» пры рэдакцыі раённай газеты «Лідская газета». Мы вырашылі пагутарыць з дасведчаным даследчыкам і вопытным арганізатарам музейнай справы пра літаратурнае краязнаўства.**

***— Алесь, што ёсць у вашым уяўленні літаратурнае краязнаўства?***

— Гэта вельмі шырокае паняцце. У яго ўваходзіць не толькі збіранне літаратурных скарбаў, але і грунтоўнае вывучэнне іх. З літаратурай ідзе побач фальклор, за ім — этнаграфія, а таксама дыялекталогія, затым — тапаніміка і г. д. Гэта значны трывалы ланцужок і добры кавалак працы для даследчыка.

Мастацкі твор можа ўзнікнуць і на глебе народнай творчасці, зыходзячы з ведання народнага жыцця, усіх яго адметнасцяў. Некаторыя з такіх мастацкіх твораў у мінулыя гады лічыліся народнымі, ананімнымі. Важнай асаблівасцю ў перадачы рэальнага жыцця павінна служыць і жывая мова. Так, гэта тая найкаштоўнасць, якая перадаецца нам з мінулага, той фундамент, на якім трымаецца той ці іншы населены пункт. А яшчэ, паверце, на любой тэрыторыі ёсць свае адметнасці ў гаворках. Яны, гэтыя адметнасці, заўважны і сёння. Іх неабходна захаваць — гэта ж моўныя залацінкі! З падобным узорам мастацкай літаратуры мы ўжо знаёмы. Яго пакінуў нам Іван Мележ у рамане «Людзі на балоце», пакінулі іншыя пісьменнікі.

А няўжо не павінна чытача цікавіць, адкуль паходзіць аўтар, адпаведна, адкуль паходзіць і сам твор, а можа, нават і герой? Чым значная, чым прыкметная тая мясціна, у якой нарадзіўся літаратар? Якая адметнасць гэтай тэрыторыі праявілася ў напісанні твора? У гэтую зацікаўленасць прывядзе ўжо другая навука — тапаніміка.

Сувязі з іншымі навукамі можна прыводзіць і далей. А абагуліць увесь гэты стос гісторыя. Так з розных кірункаў даследаванняў і складваецца літаратурнае краязнаўства.

***— Вы доўгі час працуеце над захаваннем, музеефікацыяй памяці пра Валянціна Таўлая. Як лічыце, маштаб якога пісьменніка варты захавання праз стварэнне музея? Дзяржаўнага ці грамадскага музея...***

— Каб падысці да разгляду гэтага пытання, неабходна вызначыць, у чым жа заключаецца дзейнасць таго творцы. Які след пракладзены ім? Якую ролю адыграла напісанае ім у развіцці грамадства?..

Не так даўно, калі даводзілася мне даследаваць жыццё і творчасць Валянціна Таўлая, фонд якога захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, выпала магчымасць пагутарыць з архівісткай, даследчыцай беларускай літаратуры Ганнай Вячаславаўнай Запартыка, якая на той час узначальвала гэтую ўстанову. Дык яна зрабіла слушную для мяне папраўку, прамовіла, што Таўлай — гэта не толькі паэт, ён вышэй паэта. І гэтая тэарэма мяне прыўзняла таксама. Разгадаць яе выпала мне за гонар. Адказ ляжыць на паверхні. Жыццё Валянціна Таўлая — гэта хадзьба па лязе нажа. У маладыя гады ён заклікаў народ звацца беларусамі, і было гэта ў той час, калі насельніцтва Заходняй Беларусі знаходзілася пад пятою палянізацыі. За свае ўчынкі ў маладыя гады паэт быў пазбаўлены волі. Адноўчы, згадваў былы міністр асветы Міхаіл Мінкевіч, калі падчас зняволення ў Гродне ў верасні 1939 года ўсіх палітычных вязняў хацелі расстраляць, дык Таўлай першы сярод іх ганарова ўздымаў галаву і моцна, так, каб усе пачулі, даносіў праз краты словы з верша Уладзіслава Бранеўскага «На смерць рэвалюцыянера». А калі казаць пра час Вялікай Айчыннай вайны, Таўлай не менш рызыкаваў сваім жыццём. Прымаючы ўдзел як сувязны ў



дзейнасці партызанскага атрада імя Катоўскага (брыгады імя Дзяржынскага), а затым уваходзячы ў дыверсійную групу «Буравеснік», па заданні камандавання ён дае згоду «працаваць» на немцаў, разумеючы, што гэта канспірацыя можа дарагога каштаваць. Фашысты, паліцаі маглі б яго закатаваць, расстраляць, калі б толькі ведалі, хто ён ёсць на самай справе, якіх поглядаў прытрымліваецца. І пры гэтым ён прадаўжае прыдумваць розныя псеўданімы, накшталт Мсцівец, якімі падпісваецца пад творамі ў агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну». Пабачыў краты Валянцін Таўлай і ў Лідзе падчас Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым зняволенні ён напісаў шэраг працізлівых вершаў. Адзін з іх — «Сон Гітлера», які потым знойдзе месца на старонцы агітплаката, што высмейваў фашыстаў і іх прыслугачоў.

Барацьба з польскай уладай, з нямецка-фашысцкім рэжымам — чым не подзвіг у імя свайго беларускага народа?! У творах паэт і разгортвае сваю місію на зямлі. У гэтым жа і заключаецца гераізм, які варты таго, каб аб ім помнілі нашчадкі.

Дзеля ўшанавання такіх асоб павінны патурбавацца дзяржава, усё грамадства. У Лідзе дом, дзе жыў В. Таўлай, — гэта адзіны аб'ект, што звязаны з памяццю пра легендарнага заходнебеларускага паэта і які ўцалеў да нашага часу. І ўжо хутка як 15 гадоў ён з'яўляецца музеем — аб'ектам менавіта дзяржаўнай установы Лідскага гісторыка-мастацкага музея. Няхай ён і невялікі, з камернымі выставачнымі заламі, але ж працуе з падтрымкай дзяржавы. Да 110-годдзя з дня нараджэння ВалянцінаТаўлая ў дом паэта былі перададзены матэрыялы з 15 самых розных арганізацый (з музеяў, архіваў, бібліятэк), дзе захоўваецца яго эпісталярная спадчына. Супрацоўніцтва, звязанае з перадачай архіўных матэрыялаў, было наладжана ці не ўпершыню. Падзея прайшла маштабна, урачыста, па-дзяржаўнаму.

***— На ваш суб'ектыўны погляд, ці дастаткова ў нас літаратурных музеяў? У знак памяці каго варта адкрыць, заснаваць пісьменніцкія музеі на Гродзеншчыне?***

— Так склалася з часам, што наведвальнасць такіх профільных музеяў скарачаецца. Патрэбен пошук навацый, таму музейшчыкі стараюцца ісці ў нагу з часам, ствараюць анімацыйныя пераўтварэнні, ладзяць тэатралізацыі з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Такая праца пракладзена з той мэтай, каб прадметы, экспанаты цяпер самі гаварылі за сябе, каб дух таго ці іншага гаспадара лунаў у музейнай прасторы. У народзе кажуць: «Быў час, была эпоха». Так, менавіта тыя асобы і сталі неўміручымі. Ім ставяць помнікі, у іх гонар называюць вуліцы, адкрываюць музеі. Раней пісьменнік з'яўляўся нібыта боскай асобай, перад ім здымалі капелюшы. А што цяпер? Не хачу крыўдзіць сучаснае пакаленне, але народнае выказванне пра тое, што «і жук і жаба цяпер пішуць», з кожным годам набывае сугучны часу сэнс. Угнаца за найлепшым друкаваным прадуктам не паспяваеш. Паліцы ў бібліятэках, крамах перапоўнены кнігамі, а чытачоў усё менш і менш. Папяровую кнігу цяпер замяніў электронны адпаведнік, які стаў зручнейшы чытачу-прыхільніку. Тое ж і з літаратурнымі музеямі — ствараюцца віртуальныя выставкі, адбываюцца знаёмствы з экспазіцыямі праз QR-коды, працуюць аўдыягіды, інтэрнэт-сайты і г. д. Безумоўна, сярод гэтага бурлівага жыцця яшчэ застаюцца прадстаўнікі старэйшага пакалення, якім даспадобы пазнаёміцца з музеем сам-насам, ужывую. Але ва ўсялякім разе месца літаратурным музеям у асветніцтве, культурным жыцці павінна быць: ці то яны будуць размяшчацца ў дзяржаўных установах, прыватных арганізацыях ці пры грамадскіх аб'яднаннях. Часам грамадскія музеі, створаныя пры адукацыйных установах, насычаны не горш за тыя, што месцяцца ў асобных будынках.

На Гродзеншчыне ёсць літаратурна-краязнаўчы музей у Астрынскай сярэдняй школе, што ў Шчучынскім раёне. Гэта адзіны музей у Беларусі, які прысвечаны класіку беларускай літаратуры Цётцы — Алаізе Пашкевіч. Там вучні самі праводзяць экскурсіі. Кіруе работай настаўнік беларускай мовы і літаратуры Ала Балобан. Музей мае статус «народны». У вучэбна-педагагічным комплексе Крупаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа, што на Лідчыне, працуе таксама не меней цікавы музей — «Час. Падзеі. Людзі», у якім сабраны матэрыялы пра знакамітага чылійскага вучонага і нашага суайчынніка Ігната Дамейку. Таксама з удзелам вучняў праходзяць экскурсіі, прыязджаюць знакамітыя людзі, цікавяцца гісторыяй земляка. Доўгі час адказваў за гэты музей настаўнік гісторыі Іван Гівойна. Ведаю, што і ў Скідзельскім дзяржаўным каледжы ёсць літаратурна-краязнаўчы музей імя Міхася Васілька, кіраўнік якога — Святлана Сарокіна.

Гродзеншчына — гэта тэрыторыя, калыскай якой сталі знакамітыя людзі, што праславілі Беларусь далёка за межамі: Янка Брыль, Алег Лойка, Анатоль Іверс, Аляксей Карпюк...Пэўна, варта згадаць імёны такіх майстроў прыгожага пісьменства, як Валянцін Блакіт, Вячаслаў Адамчык, Аўгіння Кавалюк, Уладзімір Калеснік, Адам Мальдзіс, Артур Цяжкі... Яны таксама заслугоўваюць увагі і пашаны. Безумоўна, адводзяцца месцы і для іх кніг з дароўнымі надпісамі, рукапісамі ды іншым матэрыялам дзеля захавання. І ўжо няважна, у якім музеі: ці то пры адукацыйнай установе, грамадскім або дзяржаўным. Час потым раскладзе ўсё на свае месцы. Народ выбірае свайго дзеяча-куміра, толькі народ павінен палічыць яго заслугі, ацаніць вартасць асобы дзеля ўшанавання памяці. Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк, Васіль Быкаў — хіба яны імкнуліся ствараць сабе музеі? Бясспрэчна, не. Жылі як усе людзі, тварылі, а не вытваралі. І таму мы бачым сёння станоўчы вынік іх дзейнасці, станоўчую грамадскую адзнаку зробленага імі.

***— Якія формы работы па стварэнні сістэмы мясцовага літаратурнага краязнаўства падаюцца вам найболей вартымі: канферэнцыі, краязнаўчыя чытанні, мясцовы друк, турыстычныя экскурсіі ці нешта іншае?***

— У кожнага праяўляецца свой густ, вызначаюцца ўласныя прыярытэты. І тое і іншае заслугоўвае месца быць. Калі казаць ад сябе, даволі суб'ектыўна, то прызнаюся, што апошнімі гадамі мне спрыяе быць, прысутнічаць ва ўсіх гэтых формах і форумах. У большасці ў публічнай сферы, на канферэнцыях, чытаннях, з падрыхтаванымі загадзя дакладамі. Мінулы год быў насычаны для Ліды. Мы адзначылі 700 гадоў з дня заснавання горада. Галоўнай пярлінай у нас з'яўляецца Лідскі замак. У ім жа (дзве секцыі), а таксама ў Доме Валянціна Таўлая (трэцяя секцыя) і была арганізавана навукова-практычная канферэнцыя «Ліда і Лідскі край у гісторыі Беларусі» сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Ужо не першы год у раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы ладзяцца «Лідскія чытанні», у якіх прымаюць удзел не толькі навукоўцы, але і моладзь, школьнікі. Усе матэрыялы потым знаходзяць сваё месца пад адной вокладкай: бібліятэчнымі намаганнямі выходзяць адпаведныя зборнікі.

Што датычыцца мяне асабіста, то ў свой час я распрацаваў маршрут па вуліцах і аб'ектах горада «сТАЎЛенне», па адрасах, якія звязаны з жыццём і творчай дзейнасцю беларускага паэта Валянціна Таўлая. Нельга абысці і адкрыты рэгіянальны фестываль песеннага фальклору памяці Земавіта Фядэцкага «Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі...», які праходзіць у Мажэйкаве і які арганізоўвае аддзел культуры Лідскага райвыканкама.

***— Грамадства, наступныя пакаленні чытачоў могуць шмат што страціць з літаратурнай памяці народа, калі не рупіцца над мемарыялізацыяй пісьменніцтва. Якія ў гэтым ключы ініцыятывы, на ваш погляд, падаюцца лагічнымі? І ў плане помнікаў, назваў вуліц, мемарыяльных дошак...***

— Вось гэта, сапраўды, балючае пытанне. Падрастаючае пакаленне ўсё менш цікавіцца мінулым. Ад кагосьці я чуў, што калі Янка Купала быў запрошаны на нейкае пасяджэнне, то пабачыў сярод прысутных і маладых людзей. Калі яму далі слова, то ён прамовіў нешта накшталт такога: «Бачу я вас, маладыя. Але ж чамусьці ў вас слаба гарачь вочы. Вось хоць бы адзін чалавек з гэтай сотні выйшаў у людзі і заняў нішу ў пісьменніцкім асяродку...»

Хтосьці ці то жартам, ці то ўсур'ёз казаў, што калі распытвалі моладзь, хто такі Якуб Колас і Янка Купала, то адказвалі, што гэта адзін і той самы чалавек, а яшчэ і такое адказвалі нават, што яны прыдуманыя людзьмі. Але ж пакуль не ўсё згублена. Ёсць жа той, хто захавае гэтую памяць і перадасць наступным. Толькі якім чынам ён гэта зробіць? Так, тут павінна паруліцца і дзяржава, і грамадскія аб'яднанні, і прыватныя арганізацыі. Бясспрэчна, тая асоба, якая адказна ставілася да пастаўленых задач і займалася творчымі справамі, — гэта яе жыццёвыя будні, якія прынасілі асалоду, а чалавек гэты ў сваю чаргу ствараў настрой, працаваў на карысць людзям. І ён жа, на маю думку, не імкнуўся сябе ўвекавечыць у шыльдах і помніках. У гэтым рэчышчы у адказ за неабыякавасць, за талент і працаздольнасць аддзячыць павінны людзі, народ, соцыум. І гэтая падзяка павінна парадаваць шмат каго яшчэ пры жыцці. Сваіх людзей трэба ведаць у твар, ужывую. Якім чынам? У правядзенні конкурсаў і фестываляў, названых у гонар такіх асоб. Дадзены падыход добра адпрацаваны ў спартыўным асяроддзі. А чаму не арганізоўваць нешта падобнае і з літаратарамі? Глядзі, і ўжо іншыя захочуць быць падобным на гэтага героя. Гэта датычыцца сучасных творцаў. А вось ужо сама мемарыялізацыя звязана з памяццю пра чалавека, калі яго не стане. Пры жыцці — конкурсы, фестывалі, а ўжо пасля смерці — шыльды на будынках, назвы вуліц, помнікі — даніна памяці, стварэнне музеяў і экспазіцый.

У 2014 годзе ў свой 85-гадовы юбілей ганаровы грамадзянін Лідскага раёна Аляксандр Каранюк прэзентаваў аўтабіяграфічную кнігу «Сэнс жыцця». Гэтае выданне — споведзь руплівага старшыні калгаса «Бердаўка», які сваім жыццём і справамі пакінуў для нашчадкаў адну з яркіх старонак у стваральную гісторыю Лідчыны савецкага часу. Кніга — летапіс роду Каранюкоў ад канца XIX стагоддзя да нашых дзён. Аўтар раскрыў лёсы родных, блізкіх, аднавяскоўцаў, а праз іх — лёс заходнебеларускай вёскі на працягу больш чым стагадовага адрэзка часу. Аўтар імкнуўся згадаць усіх, з кім перасякаліся жыццёвыя дарогі, з кім разам ствараў «новую» Бердаўку. Дарэчы, пры жыцці ў аграгарадку Бердаўка адна з вуліц ужо была названа яго імем. На 92-м годзе жыцця, у 2021-м, Аляксандра Аляксандравіча не стала. У тым жа, 2021-м, на 98 годзе жыцця пакінуў гэты свет яшчэ адзін яркі прадстаўнік краязнаўчага руху Лідчыны — Мікалай Мікалаевіч Дзікевіч, які да апошняй хвіліны неабыякава ставіўся да свайго краю, выдаў дзве кнігі — «Дзітрыкі. Згукі заснуўшай цывілізацыі» (пра сваю радзіму — вёску Дзітрыкі) і «Сялец. Прынёманская рэчаіснасць» (пра вёску Сялец, у якой ён пражыў большую частку жыцця). Абедзве кнігі — узор даследаванняў і напісання гісторыі вёскі. Пра ветэранаў-краязнаўцаў я згадаў тут не дзеля прыгожага слоўца. Яны — яскравы прыклад для тых, хто хоча пакінуць важкі след у гісторыі і не пайсці ў бяспамяцтва.

**Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# ТУТ ПАЧЫНАЎСЯ МЕНСК...



Раскопкі на месцы Сядзібы пачаліся зусім нядаўна.



З дапамогай такога прыбора дакладна вымяраецца ўзровень глыбіні.

**Ужо сёлета плануюць завяршыць археалагічныя раскопкі старажытнага гарадзішча на рацэ Менцы. Так што «Звязда» вырашыла не губляць часу і разам з Нацыянальным агенцтвам па турызме адправіцца ў месца, дзе ў Х стагоддзі пачынаў сваю гісторыю летапісны Менск.**



Трапецападобная падвеска, якая была папулярная ва ўсіх славянскіх жанчын VII—IX стст.



Гэта толькі невялікая частка знаходак.



Аляксей АЎЛАСОВІЧ дэманструе ўнікальныя драўляныя канструкцыі ў Вялікім Гарадзішчы.

## МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Археалагічны комплекс на Менцы даследуецца з XIX стагоддзя. Аднак сур'ёзныя акадэмічныя даследаванні тут пачынаюцца толькі з 1950-х гадоў. Асабліва актыўна вялася работа ў 1970—1980-х, а потым быў перапынак. Новая хваля раскопак пачалася з 2012 года, калі за даследаванні ўзяўся Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

— Гэтая тэрыторыя — гісторыка-культурная каштоўнасць рэспубліканскага значэння. Тут распрацаваны ахоўныя зоны, якія павінны не дапускаць разбурэння комплексу, — распавядае **загадчык аддзела археалогіі сярэдніх вякоў і новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі Андрэй ВАЙЦЯХОВІЧ**. — Увесь комплекс — гэта ж не толькі гарадзішча, а яшчэ пасады, якія атачаюць з усіх бакоў. Так, плошча ўсяго комплексу — 30 гектараў. Досыць вялікі горад быў.

Цяпер на тэрыторыі гарадзішча дзейнічае некалькі раскопаў. Аднак найважнейшы і перспектыўны — гэта раскоп прарэзкі паўночнай часткі вала. Што ж у ім унікальнага? Уся справа ў тым, што менавіта там, у пойме Менкі, былі выяўлены ўнутрывальныя драўляныя канструкцыі. Прычым ступень бяспекі вельмі высокая. Ні ў адной з краін Усходняй Еўропы аналагічных аб'ектаў у такім добрым стане не захавалася. А ўвесь сакрэт у тым, што ўчастак сцяны быў зроблены ў балоцістай нізіне. Менавіта гэта і дапамагло яе законсерваваць.

— Мы ажыццявілі прарэзку вала на вялікай плошчы. Да нас у Беларусі яшчэ ніхто такіх прарэзаў па маштабах не рабіў. У выніку мы знайшлі вельмі добра захаваныя рэшткі драўлянай сцяны, якая акаляла гарадзішча, — растлумачыў Андрэй Вячаслававіч.

Паводле яго слоў, час узвядзення гэтай сцяны можна лічыць пачаткам горада.

— Гэта былі вельмі складаныя ўмацаванні, некалькі ліній абароны вышынёй 6-7 метраў. Яны складаліся з шэрагу клетак, запоўненых грунтам, і ўяўлялі сабой дастаткова магутныя абарончыя збудаванні. На тэрыторыі Старажытнай Русі іх маглі сабе дазволіць толькі дастаткова буйныя, значныя гарадскія цэнтры. Па сваім маштабе і магутнасці яны супастаўныя з абарончымі збудаваннямі Мінска на Свіслачы, — дадаў ён.

Так, гэта сведчыць аб тым, што жыхары Мінска былі ў курсе ўсіх сучасных тэхнік будаўніцтва, валодалі імі. А яшчэ, на думку Андрэя Вайцяховіча, знаходка гэтых клетак выразна паказвае, што тут быў дастаткова буйны горад, які ўзнік у самым канцы Х стагоддзя і можа атаясамлівацца з летапісным Менскам.

## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ І АРТЭФАКТЫ

Безумоўна, на тэрыторыі гарадзішча было знойдзена шмат цікавых артэфактаў. Спецыяльна для гасцей некаторыя з іх выставілі пад шкляным купалам.

— Такія знаходкі ў археалогіі называюцца індывідуальнымі, таму што яны са шкла і металу. Тут прадстаўлены ў тым ліку і найноўшыя знаходкі, якія зусім нядаўна ляжалі ў зямлі, — тлумачыць **загадчык цэнтра археалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксей АЎЛАСОВІЧ**. — Тут прадстаўлены і элементы матэрыяльнай культуры, а менавіта жаночага ўбору, каралі сердалікавыя, з горнага крышталю, шкляныя каралі.

Усіх артэфактаў, знойдзеных за час раскопак, хапіла б на цэлы музей з лішкам.

— Вельмі шмат знойдзена вырабаў з металаў, шкла, гліны, каменю... Расказваць можна бясконца, але вылучым асноўнае. Так, важнай знаходкай з'яўляецца бронзавы гузік з пазалотай, на якім намалявана абліччa Хрыста. Выкананы ён у візантыйскім стылі. Такія гузікі-драбніцы часцей за ўсё выкарыстоўваліся ва ўборы святара. Гэтая рэч датуецца другой паловай XI — XII стагоддзяў. Гэта паказвае, што ўжо ў той час тут знаходзіўся святар дастаткова высокага рангу, — дзеліцца Андрэй Вайцяховіч. — Таксама знойдзены цэлы шэраг нацельных крыжыкаў, пачынаючы ад канца Х стагоддзя і заканчваючы XII стагоддзем. Атрымліваецца, што гэты горад з ранніх часоў з'яўляўся носьбітам хрысціянскай культуры і распаўсюджваў яе на сельскую язычніцкую акругу.

Акрамя таго, ён адзначыў сёлета знойдзены шэраг артэфактаў, якія сведчаць аб прысутнасці на селішчы дружыны.

— Гэта баявая сякера скандынаўскага тыпу, вельмі рэдкая і дарагая, фрагменты кальчугі, элементы пасавай гарнітуры дружыны, шматлікія наканечнікі стрэл, рэчы элітарныя, — распавядае Андрэй Вячаслававіч.

Аднак гэта не гаворыць аб тым, што горад быў княжацкім цэнтрам, дзе жыў князь са сваёй багатай дружынай. Хутчэй гэта быў абласны цэнтр, дзе прысутнічала княжая адміністрацыя, баярскае насельніцтва і невялікі кантынгент дружыны.

Яшчэ цікава і тое, што пры раскопках малога гарадзішча былі выяўлены сляды вялікага пажару, які, хутчэй за ўсё, узнік у выніку ваеннага канфлікту.

— Мы ўзялі ўзоры вугалю для правядзення радыевугляроднага аналізу. І, магчыма, установім дату гэтага канфлікту. Ёсць варыянт, што гэта можа быць звязана з падзеямі 1067 года, — дзеліцца Андрэй Вайцяховіч.

## НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ

Сёлета да кастрычніка плануюць завяршыць усе раскопкі і пачаць працэс музеефікацыі.

Менавіта цяпер вядзецца некалькі раскопаў. Так, зусім нядаўна пачаліся работы на тэрыторыі вялікага гарадзішча.

— Знята каля 40 сантыметраў, і пакуль ідуць перамяшаныя матэрыялы XVIII—XIX стагоддзяў разам з матэрыяламі Х і першай паловай XI стагоддзяў. Ужо з'яўляюцца некаторыя навалы камянёў. Гэта рэшткі печы-каменкі або жылля, таксама тут ёсць разваліны сядзібы XVIII—XIX стагоддзяў, — дзеліцца Аляксей Аўласовіч.

Таксама працягваюцца раскопкі і на малым гарадзішчы. Гэта самая старажытная частка археалагічнага комплексу, якая ўзнікла яшчэ ў жалезным веку.

— Мэта гэтага раскопу — даведацца канструкцыю вала, як ён фарміраваўся і ці былі нейкія ўмацаванні-падсыпкі ў перыяд Старажытнай Русі, — тлумачыць спецыяліст.

Што ж будзе з гэтым комплексам пасля завяршэння археалагічных работ? Варыянтаў некалькі: альбо на гэтым месцы будзе пабудаваны ўнікальны музей пад адкрытым небам, альбо будзе створаны спецыяльны павільён на тэрыторыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Безумоўна, першы варыянт быў бы значна больш прывабны для турыстаў. Аднак ёсць шмат унутраных нюансаў, і канчатковы выбар будзе за спецыялістамі музейнай справы і архітэктарамі.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 20 сентября 2024 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 90 % после шестых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий и сооружений производственной базы, расположенных по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Революционная, 2А, принадлежащих открытому акционерному обществу «Дорожно-строительный трест № 2, г. Гомель» на праве собственности**

**Лот № 1**

**Административное здание конторы, инв. № 343/С-95854** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А). Назначение: здание административно-хозяйственное. Двухэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки (реконструкция 2022 год). Общая площадь 454,7 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Материальный склад, инв. № 343/С-78607** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/4). Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки. Общая площадь 338,8 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Реммастерские, инв. № 343/С-78606.** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/1). Назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции). Одноэтажное кирпичное здание, 1974 года постройки. Общая площадь 1 082,7 кв. м. Составные части и принадлежности: шесть пристроек.

**Сети водопровода (внеплощадочный водопровод, внутриплощадочные водопроводные сети на промбазе), инв. № 343/С-95922** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А, сети водопровода). Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения, 1974 года постройки. Протяженность 239,6 кв. м. Составные части и принадлежности: внеплощадочный водопровод (трубопровод пэ63 – 2 шт., трубопроводная арматура – 2 шт., колодец ВК-1), внутриплощадочные водопроводные сети на промбазе (трубопровод пэ63).

**Трансформаторная подстанция, инв. № 343/С-95923** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/5). Назначение: сооружение специализированное энергетики. Одноэтажное кирпичное сооружение, 1975 года постройки. Общая площадь 38,3 кв. м.

**Ангар для технического обслуживания дорожных машин, инв.№343/С-78608** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А/3). Назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции). Одноэтажное металлическое здание, 1994 года постройки. Общая площадь 363,0 кв. м.

**Благоустройство-ограждение, инв.№343/С-95924** (г. Хойники, ул. Революционная, 2А, ограждение). Назначение: сооружение неустановленного назначения, 1991 года постройки. Составные части и принадлежности: два ограждения

**Начальная цена лота: 102 957,12 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
**Задаток: 1 000,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве постоянного пользования площадью 4,4182 га с кадастровым номером 325450100001017061. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению, площадь 4,4182 га, и расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,3427 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 19.09.2024 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **20.09.2024 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 27.08.2024 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 18.05.2023 г. № 93, от 03.08.2023 г. № 148, от 07.10.2023 г. № 195, от 20.12.2023 № 246, от 23.03.2024 г. № 59, 05.06.2024 г. № 108 и на официальных сайтах Госкомимущества РБ и Гомельского облисполкома в эти же даты

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47; сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by.**
**Продавец: ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель», г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, тел.: +375 232 33-84-69; +375 44 502-24-31; 29 937-62-18.**

---

ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

